незалежная газета

№ 16 (661) 28 красавіка 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднооўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Дзе самы танны мабільны інтэрнэт?**

Старонка 15



**Куды паехаць улетку?**

Старонка 4



**Ганна Хітрык: Хачу і пяю**

Старонка 11

## У НУМАРЫ

**Курманбек Бакіеў з Мінска падкусвае Маскву**

Тым часам новы ўрад Кыргызстана патрабуе яго экстрадыцыі. **Старонка 2.**

**БХД здала залік**

Традыцыйны «Чарнобыльскі шлях» адбыўся 26 красавіка. **Старонка 5.**

**Лібералізацыя — найлепшая контррэвалюцыя**

З паслання Лукашэнкі нацыянальнаму сходу вынікае, што ён канчаткова развітаўся са старымі марамі. Піша Віталь Сіліцкі. **Старонка 7.**

**Людзі бароняць танкі свае**

Жыхары Езярышча не далі вывезці з пасёлка савецкі танк-помнік. У яго абарону падпісаўся кожны чацвёрты. **Старонка 5.**

**Для каго будуем аграгарадкі?**

Глінное ў Докшыцкім раёне: новыя дамы паўстаюць уздоўж дарог, старыя закінутыя. **Старонка 6.**

Там, дзе святое, дзе нашы душы рукаюцца, гэтыя вырадкі мацюкаюцца! Літаратура. **Старонка 13.**

**Абы Не Было Вайны — 2**

«Стомленыя сонцам-2»: кроў цыстэрнамі і кішкі на гусеніцах. **Старонка 11.**

**Спачатку аднавілі замак, пасля — краіну**

Для літоўскай грамадскасці і наменклатуры адбудова замка ў Троках стала дэманстрацыяй прэтэнзій на аўтаномію ў межах СССР. Гісторыя. **Старонка 12.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

# Скандальны адпачынак Лукашэнкі

Аўстрыйская прэса: Альпійскія канікулы беларускага прэзідэнта аплачваў казіно-магнат праз сакрэтны рахунак. **Старонка 8.**



PHOTO BYMEDIA.NET

# Пабіты рэкорд датэрміновага галасавання

**Участкі стаялі пустыя, але яўка склала 80%.**

Сёлетнія выбары мала чым адрозніваліся ад папярэдніх. Студэнтаў, а таксама супрацоўнікаў некаторых прадпрыемстваў і дзяржаўных установаў зноў прымусова заганялі на датэрміновае галасаванне. Між тым, менавіта вынікі датэрміновага галасавання фальшаваць найлягчэй.

Для датэрміновага галасавання пастаўлена новая рэкордная планка. За пяць дзён на ўчасткі датэрміновага галасавання прыйшло ажно 29,3%. Найбольшы паказнік тут мае Гродзенская вобласць — 33,9%. І з кожнымі выбарамі гэтая лічба толькі ўзрастае. Мінулы рэкорд быў зафіксаваны ў верасні 2008 года на парламенцкіх выбарах, калі прагаласаваць датэрмінова прыйшло 26% выбарцаў.

Агульная ж яўка склала 79%. Гэта таксама больш, чым на мінулых мясцовых.

**У саветы трапіла 9 незалежных кандыдатаў на 21 000 месцаў.**

Яшчэ ў дзень галасавання лідэр Партыі БНФ Аляксей Янукевіч прадказаў, што ніхто з апазіцыянераў не патрапіць у мінскі гарадскі савет дэпутатаў. «Што да Мінска, то я на 100% перакананы, што ўлады не дапусцяць у Мінгарсавет не тое што кандыдатаў ад апазіцыйных партый, але нават і незалежных кандыдатаў са сваёй незалежнай пазіцыяй. Тут усё будзе абсалютна пракантралявана і «закатана ў бетон», — сказаў палітык і меў рацыю.

Нікому з вылучэнцаў ад апазіцыі ў Мінску не запісалі ў выніковыя дадзеныя больш за 10%. Напрыклад, сябар Руху «За Свабоду» Алесь Лагвінец, які балатаваўся ў Сухарава, па афіцыйных лічбах, змог заняць толькі шостае месца з сямі кандыдатаў. Пры тым што Лагвінец не першы раз балатуецца ў Сухарава і заўжды збірае ў сваю падтрымку вялікую лічбу подпісаў.

## Пераможцы

Агулам ад апазіцыі ў мясцовыя саветы змагло прайсці ўсяго толькі дзевяць чалавек. Лідэрства тут належыць Беларускай партыі левых «Справядлівы свет». Яны правялі пяць сваіх кандыдатаў. Лекар Аляксандр Галькевіч абраны дэпутатам Баранавіцкага гарсавета, Уладзімір Дарапей — Брэсцкага райсавета, Іосіф Мацюн — Вілейскага райсавета, Наталля Рышард — Свіслацкага пасялковага савета (Пухавіцкі раён), Наталля Салдатава — Глыбаўскага сельскага савета (Рэчыцкі раён).

На другім месцы Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Дэпутатамі ад хадэкаў сталі тры чалавекі. Дэпутатам Асіповіцкага райсавета абраны Аляксей Цюлькоў.

**Працяг на старонцы 3.**

# Курманбек Бакіеў з Мінска падкусвае Маскву

**Зрынуты 7 красавіка прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў 23 красавіка адказаў на пытанні беларускіх журналістаў.**

Меры бяспекі былі прынятыя адпаведныя. У будынку прэс-цэнтра ў журналістаў правяралі сумкі, быў асабісты надгляд. Яшчэ перад прыходам Бакіева да журналістаў выйшаў мужчына, які прадставіўся супрацоўнікам Службы аховы прэзідэнта. Ён папрасіў карэспандэнтаў знаходзіцца на сваіх месцах, а то «бываюць выпадкі, калі ў прэзідэнтаў кідаюць чаравікамі».

«Мы ведалі, што апазіцыя рыхтуе мітынгі, і былі абсалютна спакойныя, бо прывыклі да іх», — кажа К.Бакіеў. Ён лічыць, што за апошнія пяць гадоў у Кыргызстане было зроблена больш, чым за ўсе папярэднія гады незалежнасці. У якасці прыкладаў былі прыведзеныя адрамантаваныя і пабудаваныя дарогі, школы, бальніцы, прадпрыемствы.

Бакіеў заявіў, што не збіраецца адмаўляцца ад пасады прэзідэнта Кыргызстана, але і вяртацца ў краіну ў якасці кіраўніка дзяржавы не будзе.

Што да заявы аб складанні з сябе прэзідэнцкіх паўнамоцтваў, дадзенай падчас знаходжання ў Казахстане пасля настойвання расійскага прэм'ера Пуціна, то Бакіеў заявіў, што гэта заява была дадзена пад гарантыі бяспекі яго сям'і, а таксама з мэтай не дапусціць беспарадкаў і кровапраліцця ў краіне. Але паколькі гэтыя ўмовы не былі выкананыя, то ён адмаўляецца ад такой заявы.

Бакіеў зазначыў, што Расія — Пуцін і Мядзведзеў — ніяк не маглі пагадзіцца з тым, што ЗША маюць у Кыргызстане сваю вайсковую базу «Манас». «Як гэта так, такая маленькая краіна і праводзіць сваю незалежную пазіцыю? — задаўся рытарычным пытаннем Бакіеў. — У СССР за нас усё вырашала Масква. Такі сіндром у іх яшчэ застаўся».

«Расію раздражняла і не задавальняла амерыканская база», — падкрэсліў ён.

«Расія нам абяцала вялікую дапамогу — крэдыты, гранты. Абяцала не кінуць у бядзе. І толькі мы прынялі рашэнне пазбавіцца базы, на наступны дзень усе дзяржавы рэгіёна заявілі, што гатовы прапанаваць свае тэрыторыі амерыканцам для баз. Гэта было для мяне вялікай аплявухай», — сказаў Бакіеў.

«Амерыканцы пайшлі на вялікія саступкі, і мы пакінулі базу. Гэта моцна не спадабалася расійскаму кіраўніцтву. Яны былі абураныя. У расійскіх СМІ сітуацыя ў Кыргызстане асвятлялася вельмі аднабакова. Усё звальвалі на ўладу. Не магу наўпрост сказаць, што падзеі ў нашай краіне — справа рук расійскіх спецслужб. Трэба ствараць міжнародную камісію па расследаванні», — зазначыў экс-прэзідэнт.

Курманбек Бакіеў выказаў вялікую ўдзячнасць Аляксандру Лукашэнку. «Ніякай рэакцыі АДКБ не было. Такое бяздзеянне ні да чаго добрага не прывядзе. Аляксандр Лукашэнка паступіў глыбока прыстойна і мужна. Гэта павага не толькі да мяне, але да ўсяго кіргізскага народа. Іншыя маўчаць. У думках, магчыма, і падтрымліваюць, але баяцца гэта выказваць, бо можа паўтарыцца, як са мной. Ім не хапае мужнасці».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Мінску Бакіева ахоўвае Служба аховы прэзідэнта. Беларускага.**

«Ні інтэлігент Акаеў, ні гаспадарнік Бакіеў не скарысталі ўнікальны шанец увайсці ў гісторыю як стваральнікі. Яны падманулі надзеі і спадзяванні народа», — зазначыла ў пятніцу пасол Кыргызстана ў Беларусі Ішэнкуль Балджурава. «Наш народ цярплівы да той пары, пакуль яго не дастануць. Калі яго дастаюць, то адбываюцца рэвалюцыі», — скончыла зварот пасол. Пасол Балджурава працавала міністрам адукацыі Кіргізіі ў ранейшых урадах.

Па словах Бакіева, усе ягоныя сваякі, што знаходзіліся на дзяржаўных пасадах, займалі іх справядліва. Бо якасна і добра выконвалі сваю працу. «Калі б мне трэба было красці грошы, то чужымі рукамі было б зручней гэта рабіць, чым рукамі ўласнага сына», — таксама Бакіеў абверг чуткі, што разам з сабой у Мінск ён прывёз 200 мільёнаў даляраў. Па ягоных словах, ніводзін банк у такіх экстрэмальных умовах не мог бы выдаць яму такую гіганцкую суму грошай.

«Нідзе прытулку я прасіць не буду. Так пытанне не стаіць. Урад у выгнанні ствараць не буду. Колькі буду знаходзіцца ў Беларусі, не ведаю, яшчэ не вырашыў», — зазначыў К.Бакіеў.

У аўторак жа часовы ўрад Кыргызстана зацвердзіў дэкрэт аб адхіленні Курманбека Бакіева ад пасады, пазбаўленні яго імунітэту і забеспячэнні дастаўкі на радзіму. Бакіеў абвінавачаны ў арганізацыі масавых забойстваў і злоўжыванні службовым становішчам.

**ЗП**

### Самае чытанае на nn.by за 21—27 красавіка

- Мечыслаў Грыб: «Партызаны паабяцалі расстраляць нас усіх»
- Чарнобыльскі шлях — 2010. Фотарэпартаж
- Чарнобыльскі шлях — 2010
- Die Presse: Для аўстрыйскага адпачынку Лукашэнкі маглі адмыць 200 тысяч еўра
- Кацап, чалдон з беларускай мовай і, прабачце, х.й
- Маркес пра Лукашэнку і Бакіева
- Каляндар: аголеныя жонкі брытанскіх вайскоўцаў
- Драпежная кандыдатка
- У каго з аператараў самы танны мабільны інтэрнэт?
- Гіпермаркеты таксама падманваюць

### nn@nn.by

Да артыкула «Каляндар: аголеныя жонкі брытанскіх вайскоўцаў». «Адны забіваюць, другія весяляцца з паспяховымі забойцамі. А мы... А мы атрымліваем асалоду, гледзячы на іх».

### Сцісла

• **У пятніцу — да +25 градусаў.** Да канца тыдня, паводле гідраметэацэнтра, захаваецца хмарнае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі, але патроху пачне цяплець.Так, 29—30 красавіка па краіне чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, тэмпература днём плюс 15—22°С, на поўдні да плюс 25°С. У Мінску — без істотных ападкаў. Але і без вялікага цяпла: да плюс 15°С.

• **Працоўны дзень пераносіцца з 10 на 15 мая.** Урад пастанавіў зрабіць непрацоўным панядзелак 10 мая, а замест яго адпрацаваць суботу, 15-га. Такім чынам, для большасці працоўных Беларусі нерабочымі будуць тры дні запар: 8, 9 і 10 мая.

• **Марская рыба патаннее.** Паводле ўказа Лукашэнкі, рэгуляваць рынак рыбнай і марской прадукцыі ў Беларусі будзе не Кіраўніцтва справамі прэзідэнта, як раней, а Мінсельгасхарч. Дзяржава будзе кантраляваць імпарт прэснаводнай рыбы, прадукты перапрацоўкі рыбы і морапрадуктаў. Марскую ж свежамарожаную рыбу ад 1 ліпеня змогуць імпартаваць любыя юрасобы без правядзення конкурсу.

• **У Мінску перадухіленае заказное забойства.** 39-гадовы маляр з Мінска «замовіў» жонку забойцу за пяць тысяч даляраў, каб не разыходзіцца і не дзяліць маёмасці. Кілеру было перададзенае фота ахвяры і інфармацыя, дзе і калі яна бывае. Забойства ўдалося перадухіліць: заказчык затрыманы падчас перадачы грошай кілеру.

• **Нас — 9 473 600 чалавек.** Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 красавіка 2010 года склала 9 млн 473,6 тыс. чалавек і ў параўнанні з адпаведнай датай мінулага года скарацілася на 13,4 тыс. чалавек.

### Дзе варта быць

**Дударскі фэст**

**19 мая на танцавальнай пляцоўцы парка Чалюскінцаў у Мінску** пройдзе «Дударскі фэст». Зайграюць гурты **«Стары Ольса», «Зніч», Litvintroll, Testamentum terrae, «Кейлі Кёл», «Расалія», Unia. Пачатак у 18.00.** Цана квіткоў 20—25 тысяч рублёў. Даведкі па т.: (029) 649–08–88.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

## З 1 мая змяняюцца банкаўскія рэквізіты:

**ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828**

**Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739**

**Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011**

**Від аплаты: За газету «Наша Ніва»**

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю

**Леакадзіі Н., Антону Т., Вікенцію С.** з Валожынскага раёна.
**Сяргею К.** з Слуцкага раёна.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёна.
**Ларысе Р.** з Калінкавіцкага раёна.
**І.Ц.** з Жыткавіцкага раёна.
**Мікалаю С.** з Вілейскага раёна.
**Тадэвушу Ш., Л.А.** з Маладзечанскага раёна.
**В.П., Васілю Б.** з Шчучынскага раёна.
**Аляксандру К., А.А., Ігару М.** з Магілёва.
**Яўгену К.** з Шклоўскага раёна.
**Паўлу А.** з Гомельскага раёна.
**Валерыю С., В.К.** з Віцебска.
**Н.К.** з Светлагорскага раёна.
**В.Д.** з Барысаўскага раёна.
**Алегу С.** з Бабруйскага раёна.
**А.Ю.** з Дрыбінскага раёна.
**Адзе Р., Уладзіміру Л.** з Шаркаўшчынскага раёна.
**В.Г.** з Баранавіцкага раёна.

# Пабіты рэкорд датэрміновага галасавання

Працяг са старонкі 1.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Нават у скрынях датэрміновага галасавання ветэрынар Цюлькоў перамог у некалькі галасоў. Перавага ж у асноўны дзень была больш істотнай. Супернікам Цюлькова быў намеснік дырэктара камбіната бытавога абслугоўвання.

У Аўсянкаўскай сельскай акрузе ў Горацкім раёне (тут апазіцыя мае сталую падтрымку) перамагла настаўніца Жанна Шчарбініна, кампанію якой у рэгіёне актыўна праводзілі сябры Руху «За Свабоду». Яна набрала 42%. Праўда, жанчына стала дэпутатам толькі сельсавета. У райсавет Шчарбініной трапіць не ўдалося.

Таксама дэпутатам па Сідрынскім сельсавеце ў Кобрынскім раёне стаў Віктар Бардзюг. Ён быў адзіным сябрам БХД, які балатаваўся па безальтэрнатыўнай акрузе.

Віктар Міхасёў прайшоў у дэпутаты Бараньскага гарсавета (Аршаншчына). Сябар БСДП (Г) стаў дэпутатам гэтага савета ўжо чацвёрты раз.

Ніхто ад Партыі БНФ, Руху «За Свабоду», АГП дэпутатамі не сталі. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька мяркуе, што тактыка АГП аб няўдзеле ў мясцовых выбарах была слушнай.

## Яны перамаглі ў асноўны дзень галасавання

Цікава, што ўсцяж у краіне моцныя апазіцыйныя кандыдаты перамаглі сваіх супернікаў па выніках падліку бюлетэняў за асноўны дзень галасавання, але саступілі па выніках датэрміновых.

Так здарылася ў Барысаве з эканамістам Змітром Бабіцкім. У той час як большасць барысаўскіх акруг былі безальтэрнатыўнымі, то Бабіцкаму ў супернікі вылучылі адразу двух дырэктараў — Політэхнікума і «Лесахіміка». Тым не менш, у асноўны дзень галасавання Бабіцкі адназначна перамог канкурэнтаў. 25 красавіка за яго свой голас аддалі 41,2% тых, хто прыйшоў да скрыні.

На жаль, для агульнай перамогі гэтага аказалася мала. Бо на датэрміновым галасаванні дырэктар Політэхнікума Шмакаў набраў... у два разы болей за суперніка. Бабіцкі лічыць сябе пераможцам і падаў скаргу адносна вынікаў у ЦВК.

Іван Шэга (Партыя БНФ) са Слоніма таксама выйграў у асноўны дзень выбараў — 225 на 206. А вось па датэрміновым галасаванні лічбы зусім іншыя — 46 на 210 на карысць канкурэнта. Лекар Іван Шэга — паважаны ў Слоніме чалавек.

Такая самая сітуацыя ў фельчара хуткай дапамогі з Жодзіна Аляксандра Валчаніна (АГП). Заўважым, што ўсе гэтыя людзі шмат гадоў працуюць з выбарцамі ў сваіх акругах.

«Калі вынікі датэрміновага галасавання насамрэч адрозніваюцца ад вынікаў асноўнага, то магу гэта патлумачыць агітацыйнымі мерапрыемствамі саміх апазіцыйных кандыдатаў. Іх прыхільнікі традыцыйна прыходзяць галасаваць у дзень выбараў. Таму я дапускаю, што магчымая такая разбежка ў выніках», — нічтожэ сумняшэся адзначыла на наступны дзень старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына.

## Моладзь таксама не прайшла

Актыўныя і вясёлыя выбарчыя кампаніі правялі ў розных кутках краіны некаторыя юнакі і дзяўчаты. Вынік — аднолькавы.

Аляксею Валабуеву з Салігорска запісалі 30% галасоў. Ягонаму суперніку, ваенкаму Заінчкоўскаму, — больш за 60%. Цікава, што назіральнікамі ад Заінчкоўскага былі казакі. На адным з участкаў для галасавання Івану Шылу, які быў даверанай асобай Аляксея Валабуева, казакі пагражалі збіццём. Іван напісаў скаргу ў міліцыю.

Былому палітжаўнеру Франаку Вячорку адпісалі 14% галасоў на ўчастку ў Мазыры. «Ніякіх выбараў не было, і ніхто галасы не лічыў», — кажа Ф.Вячорка.

## «Выбары нельга прызнаваць»

Рэакцыя апазіцыйных лідэраў на вынікі мясцовых выбараў была адназначнай — іх нельга прызнаваць.

«Наступныя чатыры гады апазіцыянеры павінны працаваць у сваіх акругах так, нібыта яны былі абраныя дэпутатамі. Не змяншаць сваёй увагі да гэтай акругі», — гаворыць лідэр руху «Маладая Беларусь» Артур Фінькевіч.

«Настрой у мяне добры. Пастаўленыя намі мэты дасягнутыя, — кажа лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. — Мы хацелі павялічыць пратэстны настрой у грамадстве, каб людзі больш ведалі пра альтэрнатыву, пра фальсіфікацыі. З паездак па рэгіёнах у мяне такое ўражанне, што грамадства стала больш спелым. Няма такога размежавання на тых, хто падтрымлівае ўладу і апазіцыю».

На думку экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта, найбольш актыўным кандыдатам пісалі самы малы працэнт. У прыклад Мілінкевіч прывёў Алеся Лагвінца і Юрася Меляшкевіча.

«Прызнаваць легітымнасць гэтых выбараў нельга, яны сфальсіфікаваныя. Перад прэзідэнцкімі выбарамі будзе закручванне гаек. Выпадкі з Аўтуховічам і ягонымі сябрамі, а таксама з Алесем Зарэмбюком толькі даказваюць гэта. Я спадзяюся, што апазіцыя перад выбарамі можа аб'яднацца і правесці годную кампанію», — кажа лідэр Руху «За Свабоду».

«Тыя змены, што былі ўнесеныя ў выбарчае заканадаўства, — нахабная насмешка. Большай свабоды яны не далі, — кажа лідэр Партыі БНФ Аляксей Янукевіч. — На гэтых выбарах улада змагалася нават не з апанентамі, не з іншадумствам, а з уласнымі комплексамі».

**Зміцер Панкавец**

# Ярмошына: Еўрапейскаму электарату яшчэ расці і расці да нашага ўзроўню

Кіраўніца Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына на прэс-канферэнцыі, прысвечанай правядзенню выбараў у мясцовыя саветы, патлумачыла вялікую разбежку ў выніках датэрміновага і асноўнага галасавання па некаторых акругах.

На думку спадарыні Ярмошынай, гэта абумоўлена агітацыяй апазіцыйных кандыдатаў за галасаванне менавіта ў прызначаны для выбараў дзень. «Іх прыхільнікі традыцыйна прыходзяць галасаваць у дзень выбараў. Таму я дапускаю, што магчымая такая разбежка ў выніках», — адзначыла Ярмошына.

Кіраўніца Цэнтрвыбаркама таксама пракаментавала вялікі, у параўнанні з большасцю еўрапейскіх краін, працэнт яўкі выбаршчыкаў, асабліва на датэрміновае галасаванне, якое ў іншых краінах ніколі не перавышае 1—2%. «Еўрапейскаму электарату яшчэ расці і расці да ўзроўню нашага», — паведаміла спадарыня Ярмошына.

**Алесь Пілецкі**

## Сцісла

• **Прыедзе Януковіч.** Чакаецца, што 28 красавіка прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч прыбудзе ў Беларусь з двухдзённым візітам. Праграма візіту пакуль дапрацоўваецца, але вядома, што Віктар Януковіч сустрэнецца з Аляксандрам Лукашэнкам.

• **Байкова выйшла на свабоду?** Ходзяць чуткі, што прынцыповасць праявіў генеральны пракурор краіны Рыгор Васілевіч. У панядзелак скончаўся тэрмін утрымання следчай пад вартай. Падаўжэнне тэрміну зацвярджае Генеральны пракурор, але ён адмовіўся падпісваць прадстаўленне следчых КДБ. Паводле інфармацыі сайта «Белорусский партизан», Святлана Байкова была дастаўлена ў кабінет Генпракурора, а стуль выйшла на волю пад падпіску аб нявыездзе. Байкова была арыштаваная 2 месяцы таму. Яна вяла гучныя справы аб кантрабандзе на мяжы, куды былі ўцягнуты высокапастаўленыя супрацоўнікі КДБ, у тым ліку і цэнтральнага апарату. І, быццам бы, перавысіла паўнамоцтвы.

• **Партыя БНФ стварыла сабе новы сайт.** Яго адрас — narodny.org. Як паведамляецца, стары сайт Партыі БНФ pbnf.org «больш ніколі не будзе аднаўляцца ў сувязі з тым, што да яго няма доступу».

• **Як толькі прыехаў Някляеў, запахла наркотыкамі.** Лідэр грамадскай кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў наведваў забруджаныя радыяцыяй раёны краіны. У Мазыры ў дом, куды Някляеў прыехаў для сустрэчы з жыхарамі горада, прыехала міліцыя. Шукалі наркотыкі, але не знайшлі.

• **Яраслаў Качынскі вылучаны ў прэзідэнты Польшчы.** Ён пойдзе на выбары замест свайго брата Леха, што загінуў у авіякатастрофе. Паводле прагнозаў, найбольшыя шанцы стаць прэзідэнтам мае цяпершні в.а. кіраўніка Польшчы Браніслаў Камароўскі.

**ЗП**

# Куды паехаць улетку?

Пачатак мая — апошні час, калі турысты вызначаюцца, у якую краіну варта адправіцца адпачываць улетку. Беларускія санаторыі ўжо даўно перапоўненыя — летам туды не праб’ешся. Іх акупавалі расійскія турысты, прываблены нізкімі цэнамі і высокай культурай.

Куды паехаць? Паводле падлікаў Белстата, айчынныя турысты найчасцей абіраюць Крым. І хоць яго папулярнасць падае з кожным годам, Украіна ўтрымлівае за сабой траціну турыстычнага рынку. Турцыя з Егіптам маюць на дваіх яшчэ столькі ж турыстаў. Балгарскі варыянт абагнаў расійскі, які становіцца ўсё менш папулярным. Для параўнання, за 2009 год у Беларусь прыехала на адпачынак 56 тысяч расіян. А вось у адваротны бок — усяго 22 тысячы беларусаў.

Якія плюсы і мінусы мае кожны з накірункаў адпачынку?




**Беларусь** — $200
- танна ў параўнанні з іншымі варыянтамі
- якаснае лячэнне
- непатрэбна акліматызацыя

+

- мала ўражанняў
- няма мора
- мінімальны выбар санаторыяў

−

**Крым** — $350
- настальжы па савецкіх часах
- спецыялізаванае гразевае лячэнне
- магчымасць адправіцца “дзікуном”

+

- брудныя пляжы
- савецкі хамскі сэрвіс
- цэны, як на прэстыжных курортах

−

**Балгарыя** — $390
- развітая інфраструктура
- чыстае мора
- няма моўнага бар'ера

+

- нязручная дарога на аўтобусе ці цягніку
- дарагая віза
- няма экзотыкі

−

**Егіпет** — $420
- зімовы пляжны адпачынак
- унікальны падводны свет
- запамінальныя экскурсіі — піраміды і г.д.

+

- небяспекі - шмат аварый і тэрактаў
- шчыльная "ўвага" да адзінокіх жанчын
- дарагія экскурсіі

−

**Турцыя** — $445
- невысокія цэны за якасны сэрвіс
- шоп-туры для ахвотных
- неабмежаваны алкаголь (для аматараў)

+

- спёка - да +40 градусаў (летам небяспека)
- тэракты і землятрусы
- за межамі гатэля няма чаго рабіць

−




| Кошт візаў для грамадзян Беларусі | |
|---|---|
| Балгарыя - €60 (тэрмінова- €120) | Краіны Шэнгена - €60 |
| Турцыя - $20 (па прыбыцці) | Украіна - бясплатна |
| Егіпет - $15 (па прыбыцці) | Расія - бясплатна |




**Карысныя інтэрнэт-рэсурсы:**
- **tio.by** - навіны і артыкулы на турыстычную тэму
- **belarustourism.by** - Нацыянальнае агенцтва па турызме
- **holiday.by** - каталог прапаноў ад турфірм, гарачыя туры

Падрыхтаваў ЯВ

# Эканаміст Крук: «Як мінімум да ліпеня эканоміка будзе расці»

**Незалежныя эканамісты пачынаюць верыць у паспяховасць эканамічнай палітыкі дзяржавы?**

Аналітык даследчага цэнтра Інстытута прыватызацыі і менеджменту Зміцер Крук прэзентаваў сваё даследаванне «Эканамічны рост і эканамічны цыкл у Беларусі: перспективы 2010». Гэта першая спроба распрацаваць прагноз эканамічнага развіцця краіны праз аналіз апярэджваючых фактараў. Іншымі словамі, ён выявіў, як паказчыкі накшталт аб’ёму выдадзеных крэдытаў ці колькасці прададзенай валюты ўплываюць на іншыя фактары, аж да росту ВУП. Зробленае па аналогіі з еўрапейскімі працамі даследаванне паказвае не канкрэтныя тэмпы росту, а накірункі развіцця эканомікі.

Прагноз дазваляе дакладна праілічыць сітуацыю на тры-чатыры месяцы наперад. Чым большы тэрмін прагназавання, тым меншая гарантаванасць праўдзівага выніку.

Эканаміст прыйшоў да высновы, што рост ВУП Беларусі за першае паўгоддзе можа скласці 6,5—7%. Гэта прыкладна тыя ж лічбы, якія называюцца беларускім урадам.

На думку Змітра Крука, пікам росту беларускай эканомікі можна назваць жнівень 2008 года, а дном — ліпень 2009 года. З таго часу ідзе чарговы пад’ём.

Цяпер даследчы цэнтр ІПМ збіраецца рабіць прагнозы пастаянна, апярэджваючы сітуацыю на тры-чатыры месяцы.

**Яўген Васількоў**

## Венесуэльская нафта падарожнічае па Украіне

Цана яе дагэтуль не абвяшчаецца.

Танкер «Марская зорка», нагружаны венесуэльскай нафтай «Санта-Барбара», даплыў да Адэсы ў ноч з 24 на 25 красавіка. На наступную раніцу пачалася перакачка нафты ў рэзервуары, а пасля 80 тысяч тон пагрузілі на чыгунку. У канечным пункце, Мазыры, «Санта-Барбару» чакаюць у пачатку мая.

Ці выгадная задума з нафтай для Беларусі, невядома. Адзіныя агучаныя ўрадам падлікі сведчаць, што пры нейкіх умовах наша краіна можа зарабляць па $60 з барэля. А вось пра выгаду кантракта для Венесуэлы паведаміў амбасадар гэтай краіны. Ён удакладніў, што ўмовы пагаднення ўсё яшчэ ўзгадняюцца.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Францыя зацікаўленая ў пабудове АЭС у Беларусі.** Пасол Францыі Мішэль Ранеры заявіў, што «французскія станцыі найлепшыя і найнадзейнейшыя ў свеце». Ён адзначыў, што рашэнні аб будаўніцтве прымае не ўрад Францыі, а непасрэдна кампаніі. Таксама застаецца адкрытым пытанне магчымага фінансавання французскіх кампаній у будаўніцтве беларускай АЭС.

• **Копія Беларусі.** На пляцы паміж праспектам Пераможцаў (Машэрава) і ракой Свіслач у Мінску з’явіцца парк «Беларусь». Яго плошча складзе каля 30 га. Разыначкай цэнтральнай часткі парку стане экспазіцыйная тэрыторыя «міні-Беларусь». Контур гэтай тэрыторыі паўтарае карту краіны. Тэрыторыі абласцей вылучаны ландшафтнымі кампазіцыямі, уласцівымі для кожнага рэгіёна. На месцы гістарычных і прыродных выбітнасцяў будуць размешчаныя макеты вядомых збудаванняў у маштабе 1:25. Для стварэння парку спатрэбіцца некалькі гадоў.

• **Цэны на жытло працягваюць зніжацца.** За тыдзень з 12 па 19 красавіка, паводле звестак аналітычнага цэнтра realt.by, сярэдняя цана прапановы квадратнага метра кватэр на другасным рынку жылля ў Мінску паменшылася на 0,1% і склала 1429 даляраў. Зніжэнне назіраецца сем апошніх тыдняў.

• **$2 мільярды ў попел.** Паводле падлікаў Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарту, такую суму страцілі авіякампаніі праз прастой ад попелу, выкінутага ісландскім вулканам. Першыя тры дні забароны на палёты авіякампаніі гублялі 400 мільёнаў даляраў штодня.

**ЯВ**

# БХД здала залік

«Чарнобыльскі шлях» 26 красавіка сёлета арганізавала Беларуская хрысціянская дэмакратыя.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Віталь Рымашэўскі абвесціў пачатак нацыянальнай кампаніі супраць вымірання беларусаў.**

Пасля таго як Партыя БНФ адмовілася ад удзелу ў сёлетнім «Чарнобыльскім шляху», арганізацыю традыцыйнага шэсця ўзяла на сябе Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Гэта было баявое хрышчэнне партыі па арганізацыі вулічных акцый.

І трэба адзначыць, што з пастаўленай задачай «хадэкі» справіліся. Такой паняверкі і разгубленасці, як летась, гэтым разам на «Чарнобыльскім шляху» не было.

Сярод навінак — міліцыя паставіла металашукальнікі. І кожны ўдзельнік акцыі павінен быў прайсці праверку і асабісты надгляд. Павел Севярынец адрэагаваў на гэта катэгарычна: «Першае ўражанне, што ты знаходзішся ў зоне». Мінакі таксама зацікавіліся такім відовішчам. Шмат хто думаў, што ля Акадэміі навук будзе нейкі канцэрт.

Афіцэры з афіцыйнай прэс-групы паведамілі, што падобныя меры бяспекі будуць ужывацца і на наступных масавых акцыях. Зрэшты, ніякіх «тэрарыстаў» амапаўцы не выявілі.

На пляцоўцы ля Акадэміі навук прайшоў невялікі мітынг. Кандыдат ад БХД на прэзідэнцкія выбары Віталь Рымашэўскі заявіў пра пачатак нацыянальнай кампаніі супраць вымірання беларусаў.

І хоць арганізатары прасілі ўсе палітычныя сілы быць толькі з нацыянальнай сімволікай, не выкарыстоўваючы сваёй (сцягоў БХД не было), але некаторыя моладзевыя арганізацыі ўсё ж не паслухаліся.

Былі на акцыі Аляксандр Мілінкевіч, Уладзімір Някляеў, Аляксей Янукевіч, але яны заставаліся ў цені.

Адбыўся і невялікі перфоманс. Выйшла чорная свіння-мутант з рагамі, яна сімвалізавала Чарнобыль. Сэнс акцыі ў тым, што зло (Чарнобыль) можна перамагчы толькі дабром. Дзяўчына ў белым адзенні абламала рогі свінні, а потым забіла.

Калі пачалося шэсце, людзей значна пабольшала. Далучыліся тыя, хто не хацеў ці збаяўся прайсці праз металашукальнікі, за агароджу. Усяго ўдзельнікаў налічвалася больш за тысячу чалавек.

Жалобным шэсце не было. На працягу ўсяго шляху спявалі беларускія песні, гукалі «Жыве Беларусь» і «Не — Астравецкай АЭС». Абсалютную большасць удзельнікаў акцыі складала моладзь. Ніякіх правакацый з боку міліцыі не было.

Мерапрыемства скончылася ля памятнага знака ў памяць ахвяр Чарнобыльскай АЭС, што на вуліцы Карастаянавай. Удзельнікі запалілі свечкі ў памяць аб памерлых. Ушанавалі іх хвілінай маўчання, праспявалі «Магутны Божа».

Першы залік па арганізацыі вулічных акцый БХД здала.

**Зміцер Панкавец**

# Людзі бароняць танкі свае

Жыхары Езярышча не далі вывезці з пасёлка савецкі танк–помнік, які ўлады хацелі перапставіць у Віцебск. У абарону танка падпісаўся кожны чацвёрты жыхар мястэчка.

Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ў Віцебску мае паўстаць Алея Славы. Дзеля гэтага з усяго рэгіёна збіраюць вайсковую тэхніку часоў Другой сусветнай вайны. Адзін з экспанатаў, лёгкі танк Т-70, прыгледзелі ў Езярышчы Гарадоцкага раёна.

«У людзей слёзы на вачах, ветэраны плакалі, калі даведаліся!» — жыхары Езярышча не маглі стрымаць абурэння, калі ў пасёлак прыехала спецыяльная тэхніка, каб дэмантаваць танк-помнік. Замест яго хацелі паставіць гармату з віцебскага музея Міная Шмырова. Такую ракіроўку людзі палічылі за здзек: танк стаіць на пастаменце, у падножжы якога пахаваны ўдзельнік вызвалення Гарадоччыны, камбрыг Сямён Хайдукоў. На тым танку, нібыта, камбрыг і вызваляў Езярышча. Чаго над яго магілай будзе стаяць гармата?

Людзі арганізаваліся: за дзень-два сабралі больш за трыста подпісаў (усяго ў Езярышчы каля 1200 дарослых) і даслалі іх у раён, вобласць і Адміністрацыю прэзідэнта. «Для нас гэта святое месца. Тут усе мерапрыемствы ладзяцца: ад 9 Мая да выпускных у школе і вяселляў», — кажуць тутэйшыя. Акрамя таго, танк — ці не адзіны турыстычны аб’ект мястэчка. У адрозненне ад Т-34, Т-70 — досыць рэдкая мадэль, іх па свеце засталося з дзясятак.

Мясцовыя ўлады спачатку рэагавалі на падзеі адназначна. Старшыня пасялковага савета катэгарычна заявіла: танк перавязуць у Віцебск, гэтае пытанне не абмяркоўваецца. Пасля ў аддзеле культуры Гарадоцкага райвыканкама паведамілі, што інфармацыяй пра лёс танка-помніка валодаюць толькі на ўзроўні чутак. Калі ж гісторыя з пераносам танка атрымала шырокі розгалас у прэсе, улады заявілі, што людзі «ўсё не так зразумелі»: танк ніхто не збіраўся нікуды пераносіць. Яго, нібыта, хацелі ўсяго толькі адрэстаўраваць. У панядзелак 27 красавіка старшыня пассавета афіцыйна паведаміла жыхарам, што танк застанецца ў Езярышчы.

**Сямён Печанко**

## «Плошча Леніна» пакуль застаецца

У сярэдзіне сакавіка газеты і інтэрнэт-рэсурсы распаўсюдзілі навіну аб тым, што ў Мінску знікне станцыя метро «Плошча Леніна». Планавалася, што замест яе з’явіцца «Плошча Незалежнасці». Тады ж была агучаная інфармацыя, што ўжо ў сакавіку ў цягніках метро пачуецца: «Наступная станцыя «Плошча Незалежнасці».

Прайшоў месяц, аднак новай назвы не з’явілася. Спробы «НН» высветліць прычыну гэтага разбіліся аб бюракратычныя муры Мінгарвыканкама — ніводны з суразмоўцаў газеты не змог уцямна патлумачыць, чаму пераймёнаванне дагэтуль не адбылося.

Ва ўпраўленні метрапалітэна аб планах перайменавання чулі, аднак ніякага распараджэння Мінгарвыканкама не атрымоўвалі. Таму пакуль «Плошча Леніна» застаецца.

**АП**

# Кодэкс, які нацыяналізуе сістэму адукацыі

Беларускім парламентам распрацаваны праект «Кодэкса аб адукацыі». Незалежныя эксперты б’юць у званы.

Па іх словах, дакумент скіраваны выключна на тое, каб падпарадкаваць усю сферу адукацыі дзяржаве.

«Як эксперт магу канстатаваць, што дадзены кодэкс напісаны непасрэдна для Міністэрства адукацыі, каб паспяхова кантраляваць дзейнасць педагогаў і навучэнцаў. І выключаецца магчымасць кантраляваць само міністэрства і тыя дзяржаўныя ўстановы і асобаў, якія прымаюць рашэнні наконт будучага беларускай школы і адукацыі», — адзначае кандыдат педагагічных навук Святлана Мацкевіч.

Такім чынам, з працэсаў адукацыі будуць выключаны непажаданыя для дзяржавы няўрадавыя арганізацыі. Каб такі пасыл завуаляваць, у праекце кодэкса прадугледжваецца ліцэнзаванне ўсёй адукацыйнай дзейнасці. Маўляў, любая арганізацыя, дзяржаўная ці прыватная, можа атрымаць ліцэнзію і займацца адукацыйнымі працэсамі. Але на справе ўсё будзе куды складаней, лічыць юрыст Вольга Смалянка. «Пры сённяшніх патрабаваннях ні адна грамадская арганізацыя не зможа атрымаць ліцэнзію. Але вялікае пытанне, ці змогуць дзяржаўныя ўстановы запоўніць усе нішы».

Яшчэ адна праблема, якая паўстане ў выпадку прыняцця дакумента, — забарона на прафесію. У праекце кодэкса гаворыцца, што педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы, пазбаўленыя такога права. Але не ўказана, хто і за што можа пазбавіць яго. «Калі ў законе не патлумачана гэта, то трэба разумець, што забараніць займацца педагагічнай дзейнасцю можна без падстаў. Калі начальнік захоча звольніць педагога без прычыны, ён гэта зможа зрабіць», — адзначае сп. Мацкевіч.

Адзін з распрацоўшчыкаў кодэкса, дэпутат парламента Уладзімір Здановіч лічыць крытыку неабгрунтаванай. «Дадзены кодэкс прысвечаны сістэме адукацыі з боку дзяржавы ў першую чаргу. Бо дзяржава адказная за адукацыю сваіх грамадзян. Ёсць шмат жадаючых, якія хочуць ускочыць у вагон, не набыўшы білет. Гэтага кодэкс не дапускае. Што значыць, калі нехта не жадае атрымліваць ліцэнзію, але хоча прыехаць і правесці трохдзённы семінар? Нагаварыць невядома чаго і пры гэтым не паведамляць у Міністэрства адукацыі ці іншыя дзяржаўныя органы пра сваю дзейнасць? А потым з’ехаць і не адказваць за вынікі? Такога не павінна быць. Адукаваць — гэта значыць мяняць светапогляд чалавека. А ў якім кірунку ён будзе змяняцца — гэта важна для дзяржавы». Дэпутат таксама запэўнівае, што ніякай забароны на прафесію кодэкс не нясе. І ніхто, акрамя суда, не зможа пазбавіць права займацца педагагічнай дзейнасцю.

Праект кодэкса ўжо прыняты ў першым чытанні. Цяпер, калі ідзе вясновая сесія парламента, у парадку дня разгляд дакумента не стаіць. Але Уладзімір Здановіч кажа, што «мы настолькі ўцягнуліся ў працу, што яна можа быць завершана ў пачатку мая. Калі гэта адбудзецца, то тады мы накіруем яго на ўзгадненне ў Савет міністраў, у Цэнтр законапраектнай дзейнасці і ў Адміністрацыю прэзідэнта. Пры атрыманні адтуль станоўчых адказаў мы можам ужо на пачатку лета разглядзець яго ў другім чытанні».

**Сяргей Макарэвіч**

Цалкам гутаркі са Святланай Мацкевіч і Уладзімірам Здановічам чытайце на nn.by.

# Для каго будуем аграгарадкі?

**Гліннае ў Докшыцкім раёне: новыя дамы паўстаюць уздоўж дарог, старыя закінутыя.**

Дастаткова аднойчы праехаць які-небудзь дзясятак кіламетраў па сельскай мясцовасці, каб назаўжды зразумець, што вёска не «адраджаецца», як пра гэта паведамляе афіцыйная прапаганда, а імклівымі тэмпамі занепадае. Пусцеюць ужо не толькі аддаленыя вёскі, але і цэнтры калгасаў ды саўгасаў.

Гліннае — вёска ў Докшыцкім раёне з паўтысячным насельніцтвам, пры дарозе з райцэнтра да мястэчка Верхняе Беразіно. У міжваенны час паблізу яе праходзіла польска-савецкая мяжа; Гліннае было з савецкага боку. У гісторыі Гліннае ніколі нічым не вызначалася, толькі пасля вайны стала цэнтрам саўгаса «Камунар» і, адпаведна, цэнтрам прыцягнення для жыхароў навакольных паселішчаў. У Глінным можна пабачыць з дзясятак узораў аграархітэктуры позне-савецкага, постсавецкага ды лукашэнкаўскага перыяду. Некалькі год таму саўгас «Камунар» далучылі да больш паспяховага калгаса «Таргуны». У планах «вертыкалі» — ператварэнне Гліннага ў аграгарадок.

Уезд у вёску выглядае ў найлепшых традыцыях афіцыйнай прапаганды — паўдзясятка прыгожа памаляваных аградомікаў стаяць роўным шэрагам уздоўж галоўнай дарогі. Малюнак так і просіцца на перадавіцы «саўбелкі». А крыху далей — метраў праз дзвесце — тры пустыя двухпавярхоўкі, збудаваныя ў 1980-х гадах. Каля адной гуляюць у «даганялкі» вясковыя дзеці, якія не маюць іншага спосабу баўлення часу. У другой ідзе «застолле» глінскіх п’яніцаў. Мясцовы люд співаецца, моладзь імкнецца з’ехаць.

Адраджаць вёску, захоўваючы калгасна-саўгасны лад, — усё роўна што фарбаваць спарахнелую сцяну.

...Старыя людзі з замілаваннем распавядаюць, як за часамі іх дзяцінства вяскоўцы аддана апрацоўвалі сваю ўласную зямлю, а моладзь ехала за акіян на заробкі, вярталася дадому і набывала зямлю. Сёння ўсё наадварот. Змяніць нешта можна толькі адным шляхам — вярнуць прыватную ўласнасць на зямлю.

**Кастусь Шыталь**



З боку Докшыцаў Гліннае выглядае ў найлепшых традыцыях афіцыйнай прапаганды.


А гэта частка Гліннага больш нагадвае закінутыя паселішчы Чарнобыльскай зоны.


Вяскоўцы, кожны на свой лад, упрыгожваюць падворкі. У кагосьці можна ўбачыць страуса.


На развалінах дзеці гуляюць у квача.

КРЫМІНАЛ

## Знойдзенае цела Драсюса Кядзіса — «літоўскага Робіна Гуда»

Каля Каўнаса быў знойдзены труп 40-гадовага мужчыны, і ўсё паказвае на тое, што гэта Драсюс Кядзіс, падазраваны ў забойстве двух чалавек, хутчэй за ўсё, вінаватых у злачынствах на глебе педафіліі.

Цела Кядзіса, якога шукала паліцыя, ужо апазналі яго сваякі. Прычыны яго смерці пакуль невядомыя. Слядоў гвалтоўнай смерці няма, але каля цела знайшлі пісталет.

У кастрычніку мінулага года ў Каўнасе былі забітыя суддзі Ёнас Фурманавічус і Віялета Нарушавічэне. У іх забойстве падазравалі Кядзіса. У 2008 годзе ён падаў скаргу ў паліцыю, заявіўшы, што да яго чатырохгадовай дачкі чапляўся педафіл. Кядзіс паказаў як на падазраваных на суддзю Фурманавічуса і бізнэсоўца Андруса Усаса, які быў абвінавачаны па гэтай справе. Нарушавічэне нібыта забяспечвала суддзі кантакт з дзіцем.

Кядзіс даслаў каля 200 лістоў з запісам аповеду дзяўчынкі пра тое, што з ёй рабілі, звяртаўся да паслоў, еўрадэпутатаў і СМІ. Але ні яго скаргі ў паліцыю, ні лісты ў свой час не пераканалі суддзяў, палітыкаў і журналістаў у неабходнасці вырашыць гэтае пытанне. Толькі пасля таго, як быў забіты суддзя, справа атрымала розгалас. Адбыліся акцыі пратэсту, прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайце адправіла ў адстаўку чыноўнікаў, якія зацягвалі справу. За месяцы, якія Кядзіса не маглі знайсці, ён набыў імідж народнага героя, абаронцы пакрыўджаных.

**Сяргей Мікулевіч**

## Здарэнні

• **37 шчанюкоў затрыманыя на мяжы.** Грамадзянін Польшчы спрабаваў без дакументаў увезці ў Беларусь 37 шчанюкоў элітных парод. 32 малыя ёркшырскія тэр’еры, дзве мальційскія балонкі і тры чыхуахуа сядзелі ў скрыні ў «Мерсэдэсе» паляка. Вёз ён «жывы тавар» на 17 млн рублёў з Польшчы цераз Літву і Беларусь у Маскву. Вядзецца следства, шчанюкоў пакуль раскватаравалі ў кіналагічным цэнтры органаў пагранслужбы ў Смаргоні.

• **Хворы на шызафрэнію задушыў аднапалатніка.** У адной з палатаў Мінскага псіханеўралагічнага дыспансера №4 знайшлі нежывога — 28-гадовага пацыента, хворага на шызафрэнію. Яго задушылі. Зрабіў гэта, як паказала праверка, іншы пацыент, 53-гадовы мужчына з такім самым дыягназам.

• **Ахвяры пасяўной.** Двое рабочых ААТ «Мсціслаўскі райаграпрамтэхснаб» загінулі ў выніку няшчаснага выпадку. Іх засыпала калійнымі ўгнаеннямі, калі яны разгружалі чыгуначны вагон у вёсцы Ходасы. Аднаму было 47 гадоў, другому — 45.

• **Школьнік дапамог затрымаць хакера.** Смешна скончылася спроба 24-гадовага цесляра з Докшыцаў зрабіць кар’еру хакера. Мужчыну «здаў» міліцыі 14-гадовы школьнік з Магілёва. Падлетак зразумеў, адкуль на яго камп’ютары з’явіўся вірус, і размясціў інфармацыю пра нядобрасумленнага карыстальніка ў сеціве. Прачыталі яе і супрацоўнікі аддзела па барацьбе са злачыннасцю ў сферы высокіх тэхналогій. Як высветлілася, гэта была першая спроба цесляра зрабіць шкодную праграму. З яе дапамогай ён атрымаў доступ да двух дзясяткаў камп’ютараў па ўсёй краіне, але скарыстаць інфармацыю не паспеў або проста не прыдумаў, што з ёй рабіць. З хакера спагналі 10 мільёнаў штрафу, а школьнік атрымаў падзяку ад міліцыі.

• **Студэнтцы далі два гады турмы за «клубнічку».** Дзяўчыну пакаралі за размяшчэнне на інтэрнэт-блогу фота і відэа парнаграфічнага зместу. Восем фота і ролік з порна 22-гадовая гарадзенка знайшла ў інтэрнэце. Суд даў ёй два гады турмы з адтэрміноўкай: калі на працягу двух гадоў не будзе гэткага болей рабіць — не пасадзяць.

• **«Хімік» напаў на пошту.** Мужчына, які адбывае пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу, што размешчана ў вёсцы Баршчоўка (Рэчыцкі раён), паспрабаваў абрабаваць мясцовае паштовае аддзяленне. Ён прыйшоў туды з нажом і забраў з касы 200 тыс. рублёў, а таксама чатыры карткі byfly і восем картак «Белтэлекама». Але далёка ўцячы не паспеў: злавілі на вакзале ў Светлагорску.

• **Рабіў піруэты на балконе і забіўся.** 21-гадовы будаўнік са Слуцка прыехаў у Мінск на курсы павышэння кваліфікацыі. Увечары, падчас пасядзелак у кампаніі ў інтэрнаце, ён выйшаў на балкон, пералез праз парэнчы і пачаў выбляць піруэты, выхваляючыся сваім уменнем і адвагай. Хлопец сарваўся з пятага паверха і разбіўся.

• **Пад Бярозай сутыкнуліся два знішчальнікі.** Падчас планавага палёта сутыкнуліся ў паветры два самалёты МіГ-29 927-й знішчальнай авіяцыйнай базы (Бяроза). Ахвяраў няма. Адзін з самалётаў лётчык вывеў у бязлюднае месца і катапультаваўся. Другі пілот паспяхова прызямліўся на аэрадроме.

• **У Мінску затрыманы выкрадальнік аўталюстэркаў.** «Працаваў» ён сталовай лыжкай. Шкода, якую ён нанёс аўтаўладальнікам, ацэньваецца ў 23 млн рублёў. Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, 22-гадовы гіцаль прызнаўся. Выкрадаў ён па начах з машын, прыпаркаваных на вуліцах Чарвякова і Нававіленскай, бульвары Шаўчэнкі. Асаблівай папулярнасцю карысталіся BMW серыі X-5 і X-6. Рынкавая цана толькі аднаго люстэркавага элемента з такога аўтамабіля складае больш як 200 еўра. Датычнасць затрыманага да аналагічных злачынстваў у іншых раёнах горада правяраецца. У дачыненні да падазронага распачата справа па ч. 3 арт. 205 КК (крадзеж).

• **Легкавік сутыкнуўся з трактарам.** Загінуў адзін чалавек, двое атрымалі цяжкія траўмы. Аварыя адбылася ў Жабінцы 20 красавіка ў 16 гадзін на вуліцы Камарова. 32-гадовы жыхар Жабінкі, кіруючы аўтамабілем «Опель-Кадэт», выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з трактарам «МТЗ-82» з прычэпам, які рухаўся ў сустрэчным кірунку. Кіроўца «Опеля» памёр на месцы. Пасажырка ледзьве выжыла.

**СМ**

# Лібералізацыя — найлепшая контррэвалюцыя

З паслання Лукашэнкі нацыянальнаму сходу вынікае, што ён канчаткова развітаўся са старымі марамі. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Чаму Лукашэнка нервова адрэагаваў на рэвалюцыю ў Кыргызстане? Бо яе выклікалі тыя ж захады Масквы, якія яна ўжывае да Беларусі, — «прагматызацыя» адносінаў у нафтагазавай сферы, рэзкае павышэнне мытаў, зацягванне з выдзяленнем крэдытаў.

Лукашэнка вывез Бакіева ў Беларусь, каб паказаць Расіі і свету, што не збіраецца дзейнічаць па любым сцэнары, што навяжа яму Масква. «Ляснуў дзвярыма» перад тым, як канчаткова адпльць у шматвектарнасць.

Віталь Сіліцкі

дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (Вільня).

Дарэчы, пра шматвектарнасць. Бакіеў спрабаваў рабіць тое, што паспяхова рабілі беларускія ўлады — ператварыў геапалітычную лаяльнасць у тавар, які, па словах беларускага кіраўніка, можна «выгодна прадаць». Своё ханства ён будаваў па схеме «грошы ў абмен на пацалункі», абяцаўшы адным за грошы выкінуць з Кыргызстана авіябазы ЗША, іншым — пакінуць.

Але Кыргызстан, у адрозненне ад Беларусі, не мог доўга функцыянаваць без фінансавай дапамогі. Тут справа і ў недзеяздольнай эканоміцы, і ў банальных прыродных і культурных фактарах, якія замінаюць аднаасобнаму кантролю над краінай з палітычнага цэнтра.

З выказванняў Лукашэнкі падчас паслання нацыянальнаму сходу можна зрабіць выснову, што ўлада развіталася з марамі пра вяртанне да дабраславёных ельцынскіх часоў.

Шматвектарнасць для Лукашэнкі — адзіная магчымасць выжыць. Стабільнасць яго ўлады цяпер залежыць не ад таго, колькі яшчэ апазіцыянераў ён кіне за краты, а ад таго, ці зможа беларуская эканоміка функцыянаваць пры высокіх цэнах на энерганосьбіты. Цяпер не час для закручвання гаек. Пятую калону Масква безумоўна ставарае, але пагрозы ад яе — не больш чым ад дохлай рыбы, што пасылала асуджанаму на смерць чыкагская мафія (забівае не сама рыба, а той, хто яе паслаў або, скажам, прафінансаваў вядомыя паштоўкі).

Галоўная контррэвалюцыйная мера Лукашэнкі — лібералізацыя, пра якую ён заявіў у пасланні.

Лібералізацыя эканомікі і дасягненне рэальнай шматвектарнасці абмяжоўваюць магчымасці выкарыстання рэпрэсіўных мераў унутры краіны.

Стратэгія выжывання ўлады на бліжэйшыя чатыры-пяць гадоў — гэта дэканцалідацыя сістэмы, якая склалася на пачатку 2000-х. Працэс гэты вымушаны і кантраляваны, але, відаць, незваротны.




## Вас прынізяць за вашы ж грошы

Металашукальнікі на месцы збору дэманстрацыі — узаконенае марнатраўства. Піша **Сяргей Мікулевіч**.

Які сэнс быў ва ўстаноўленых каля Акадэміі навук металашукальніках? Усё адно на шляху маніфестацыі да яе можа далучыцца кожны і пранесці што хоча.

Металашукальнікі на подступах да гарадскіх святаў з'явіліся пасля мінскіх выбухаў 3—4 ліпеня 2008 года. Іх перанялі з вопыту Масквы з яе частымі тэрактамі. Ні ў адной цэнтральнаеўрапейскай сталіцы такое не практыкуецца, акрамя выключных выпадкаў.

У рамках яшчэ ёсць сэнс, калі прапускаюць на мітынг ці канцэрт. Але перад дэманстрацыяй тое не мае ніякай практычнай карысці. Акрамя прыніжэння. Чалавек змушаны вывaрочваць кішэні, здымаць дзягу. Дзеля таго і прыдумалі, напэўна.

Адмыванне грошай ды імітацыя дзейнасці з боку праваахоўных органаў.

## Неінтэлігентная гульня Рады інтэлігенцыі

Саннікаў, следам за Міхалевічам, адмовіўся ад удзелу ў выбарах адзінага кандыдата пад патранажам Рады. Піша **Барыс Тумар**.

Ад супрацы з Радай інтэлігенцыі ў справе выбару адзінага кандыдата ад апазіцыі рашуча адмовіўся лідэр грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саннікаў: «Я не бачу ніякага сэнсу ўдзельнічаць. Па-першае, я бачу тут маніпуляцыі. Па-другое, я не бачу, каб быў нейкі вынік. Па-трэцяе, я не лічу, што гэта дапаможа правесці сапраўды моцную прэзідэнцкую кампанію», — заявіў ён.

Саннікаў дазволіў сабе такую рэзкасць, бо ведае, што кіраўнік Рады інтэлігенцыі вельмі блізкі да адной з палітычных груповак. І падазрае, што ні пра якую працэдуру адбору няма гаворкі. Думка толькі пра тое, як прыкрыць аўтарытэтам інтэлігенцыі кандыдатуру ад гэтай групоўкі. Адзначаецца таксама, што Рада інтэлігенцыі за пяць гадоў сваёй дзейнасці абмежавалася нешматлікімі пасяджэннямі. Чаму тады прэтэндуе на правы выбіраць? Не інтэлігентна, нарэшце, каб арбітражную структуру ўзначальваў чалавек, які сам нядаўна меў (мае?) прэзідэнцкія амбіцыі.

Гаворка ідзе пра пераатасоўку на хуткую руку картаў у апазіцыйным асяродку. Маем справу з выкарыстаннем у палітычных мэтах самога слова «інтэлігенцыя».

Перад Саннікавым адмовіўся ад супрацы з Радай Алесь Міхалевіч. Уладзіміра Коласа адныe, трэба думаць, і апазіцыйны лідэр з найбольшым рэйтынгам — Аляксандр Мілінкевіч. Сумняюся, каб мела зацікаўленасць у супрацы з Радай Беларуская хрысціянская дэмакратыя з яе сапраўды актыўнымі структурамі. Так з харошай грамадзянскай ідэі выходзіць наменклатурны пшык. А інтэлігенцыя застаецца з адпаведнай рэпутацыяй.

**Адказ Уладзіміра Коласа — у наступным нумары**

## Наша за акіянам

30 красавіка ў цэнтры Каракаса адкрыюць манумент работы класіка беларускае скульптуры Анатоля Анікейчыка. Гэты помнік Фідэлю Кастра — копія. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Арыгінал помніка, створаны ў 1973 годзе, можна пабачыць у Нацыянальным мастацкім музеі. Летуценны лідэр рэвалюцыі, яшчэ малады і энергічны, глядзіць у неба, у недасяжную будучыню.

Хоць сам Анікейчык памёр у 1997 годзе, яго творчы даробак і дасёння вызначае шлях беларускай скульптуры. Кожны ведае яго помнік Янку Купалу ў Мінску. Альбо мемарыяльны комплекс «Прарыў» пад Вушачамі ці помнік Гастэлу ў Радашковічах.

Або яго «Юнацтва», што ўпрыгожвае сквер ля Чырвонага касцёла. Аголеныя постаці дзяўчыны і дзецюка імкнуць насустрач адно аднаму скрозь вадзяныя струмені. Калі б давялося тлумачыць пануючы мастацкі метад у краіне сацыялістычнага рэалізму, гэтыя творы для прыкладу не надаліся б. Ужо тады за Анікейчыкам замацавалася слава нонканфарміста.

Ён бываў на Кубе ў 1970-я, асабіста сустракаўся з Кастра. «Востраў Свабоды» натхніў майстра на стварэнне яскравых вобразаў Чэ Гевары і Фідэля. Яны прасякнутыя гераічнай патэтыкай. Мо таму ім не знайшлося месца на плошчах брэжнеўскай эпохі — савецкія правадыры не вытрымлівалі параўнання.



Дый цяпер — на фоне гламурных манументцікаў і скульптурак, што робяцца ў Беларусі ў наш час, дэкарытыўных постацяў святых і князёў — маштаб Анікейчыка вялізарны, эпічны.

Па той бок Атлантыкі ўжо стаіць яго твор — бюст Янкі Купалы ў Араў-парку ў Нью-Ёрку... Кастра паставяць у цэнтры Каракаса, ля будынка Нацыянальнай Асамблеі.

А яшчэ дзве скульптурныя копіі бюста Аб'яднаная сацыялістычная партыя Венесуэлы падорыць Гаіці. Яшчэ адна копія будзе пастаўленая ў Нацыянальнай галерэі мастацтваў Венесуэлы.

Героі Лацінскай Амерыкі дачакаліся свайго часу. А яшчэ ж у беларускіх зборах перахоўваюцца творы Анікейчыка, прысвечаныя героям нацыянальным — Кастусю Каліноўскаму, Валянціну Ваньковічу. Мо і ім калі знойдзецца месца на плошчах. Калі не ў нашай краіне, то мо дзе яшчэ...

## Мечыслаў Грыб: «Партызаны паабяцалі расстраляць нас усіх»

Спікер Вярхоўнага Савета 12-га склікання распавядае пра сваё ваеннае дзяцінства.

«У мяне было звычайнае пасляваеннае дзяцінства ў Заходняй Беларусі ў вёсцы Савічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. У сям'і было чацвёра дзяцей...

Вёска знаходзілася побач з горадам Дзятлава, і была такая сітуацыя — днём маглі заехаць немцы, а ўначы партызаны.

Немцы патрабавалі выплаты падатку, а партызаны забіралі ўсё, што можна было з'есці і адзець. Аднойчы запатрабавалі, каб дзед аддаў парася, якое цішком гадаваў у Дзятлаве. У вёсцы нічога нельга было трымаць, бо ўсё маглі адабраць. А ў горадзе, у Дзятлаве, стаяў нямецкі гарнізон, і партызаны туды не хадзілі.

Дык вось, мы ўсе — чацвёра малых, маці, дзед — стаялі пад партызанскімі аўтаматамі, і яны пыталіся, ці ёсць кабан. І прымусілі дзеда прызнацца і паабяцаць прывезці кабана назаўтра ў партызанскую зону. І гэта было вельмі рызыкоўна, бо немцы зловяць, спытаюць, куды вязеш кабана, — і расстраляюць, а не прывязеш — партызаны паабяцалі расстраляць усіх».

**Паводле «Свободные новости плюс»**




## Жанчыны зверху

Жонкі брытанскіх вайскоўцаў сфатаграфаваліся голымі на каляндар, сродкі ад продажу якога пойдуць на лячэнне суайчыннікаў, параненых у Іраку і Афганістане. І няма сумневаў, што суму 50 маладых кабет, якія пагадзіліся на ўдзел у праекце, збяруць значную.

У сувязі з гэтым прыгадваецца «Голы каляндар», з якім як курыца з яйкам насіўся нядаўна мінскі бамонд. Наўрад ці літаратары, якія пазавалі для яго ў негліжэ, змаглі б сабраць хоць колькі на дабрачынныя мэты продажам «сябе». Наадварот: гахнулі грошы ў друк забаўкі, цікавай сфатаграфаваным ды іх знаёмым.

Але, скажаце, беларускія мадэлі-мужыкі сваім учынкам ламалі стэрэатыпы сэксісцкага грамадства. Ды сярод англічанак, пра якіх было ў пачатку, не меншы працэнт феміністак, чым на адпаведнай кафедры ЕГУ. Проста яны выкарысталі сэксізм грамадства, каб дамагчыся сваёй мэты. Высакароднай, без перабольшання. Дзеля іншай нормы прыстойнасці не варта парушаць.

**Ігар Няхведараў**

Матэрыялы, якія публікуюцца на паласе «Каментары», могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.

# Скандальны адпачынак Лукашэнкі

**Аўстрыйская прэса: Альпійскія канікулы беларускага кіраўніка аплачваў казіно-магнат праз сакрэтны рахунак.**

Сенсацыйную інфармацыю здабыў спартовы эксперт і журналіст Эрвін Рот. Ён правёў уласнае расследаванне па слядах рэвізіі, якая адбылася ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Аўстрыі. Вынік ашаламляльны: мяркуючы па ўсім, тагачасны кіраўнік аўстрыйскага НАК лабіраваў інтарэсы падкантрольнага яму гульнёвага бізнэсу, спадзеючыся пашырыць яго на Беларусь.

Сапраўды, на пачатку 2002 г. кіраўнік Беларусі адпачываў у Аўстрыі на запрашэнне тагачаснага прэзідэнта Алімпійскага камітэта краіны Леа Вальнэра. Пікантнасць сітуацыі была яшчэ і ў тым, што спадар Вальнэр з'яўляецца кіраўніком і суўладальнікам буйной сеткі казіно (Casinos Austria). Пазней Вальнэр наведаў Мінск у адказ на запрашэнне старшыні беларускага НАК, кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Піша ўплывовая аўстрыйская газета Die Presse: «Спадар Рот адчыняе сваю чырвоную тэчку. У ёй — чэкі і квітанцыі, якія распавядаюць гісторыю шыкоўнага падарожжа Лукашэнкі і сакрэтнага рахунка НАК Аўстрыі, які быў адчынены ў 2001 г. у банку Raiffeisen Bank па ініцыятыве Леа Вальнэра. 3 сакавіка 2002 г. прэзідэнт разам з жонкай, сынамі і світай паляцеў на 14 дзён у Тыроль. Кошт падарожжа — каля 200 000 еўра. Кампанія пасялілася ў двух файных гатэлях паблізу казіно. У дабрачынным хакейным турніры для ахвяраў Чарнобыля Лукашэнка забіў тры галы. Даімпрэзы далучыўся знакаміты DJ Otzi. Каштавала гэта 47 000 еўра. У тэчцы Рота падшытыя чэкі на аплату гатэльных нумароў, пракат горных лыжаў, арэнду горных бунгала. Напрыклад, бунгала Rosskopfhutte: 16 сакавіка 2002 г., кошт арэнды 1006,40 еўра, замоўлена 70 бутэлек спіртовых напояў. На чэках — нанесеная рукой чалавека пазнака: «Casino Austria, НАК Аўстрыі».

Аўстрыйская газета «Kurier» піша: «Паводле нашых звестак, былы кіраўнік НАК Аўстрыі і шэф Casinos Austria Леа Вальнэр можа быць уцягнуты ў скандал глыбей, чым гэта ўяўлялася раней. Напрыканцы 2001 г. Вальнэр адчыніў патаемны рахунак ад імя НАК Аўстрыі, праз які цягам некалькіх год былі перапампаваныя мільёны еўра. Больш за тое: на пачатку 2002 г. праз гэты рахунак праводзіліся грошы для таго, каб лабіраваць інтарэсы карпарацыі Casinos Austria. Канкрэтна гутарка ідзе пра запрашэнне беларускага кіраўніка ў сакавіку 2002 г. Гэта была шыкоўная паездка для палітыка, які, праз кепскую сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, міжнародная супольнасць пагарджала як «апошнім дыктатарам Еўропы».

«Die Presse» задаецца пытаннем: «Які быў інтарэс НАК Аўстрыі запрашаць Лукашэнку ў Аўстрыю?» «Аніякага», — лічыць Рот. Сакрэтны рахунак быў створаны з адзінай мэтай: вырашыць дылему, якая паўстала перад Casinos Austria. У Еўрасаюзе чыноўнікам забаронены афіцыйныя кантакты з дыктатарам Лукашэнкам. Але ж Вальнэр запрасіў усяго толькі прэзідэнта НАК Беларусі. То бок Лукашэнку. Экспансія на ўсход мусіла працягвацца. Вось як пракаментаваў Вальнэр гэта выданню «Presse am Sonntag»: «Мы дзейнічалі ў эканамічных інтарэсах Аўстрыі». Сапраўды, многія аўстрыйскія фірмы зацікаўленыя ў працы на 10-мільённым беларускім рынку.

Цікава, што пытанням пра тое, чаму Лукашэнка са світай адпачывае ў дэмакратычнай Аўстрыі, задаваўся яшчэ пад час ягонага візіту аўстрыйскі часопіс «Profil». І прыйшоў да высновы: Casinos Austria спадзяваліся займець перавагі на беларускім рынку. Правая рука Леа Вальнэра, дырэктар кампаніі Casinos Austria Герхард Шкоф зрабіў пад час спрэчнага візіта Лукашэнкі наступную заяву: «Калі Беларусь пажадае займець казіно, у нас будуць у руках найлепшыя карты».

Аднак, мяркуючы па ўсім, «карта не пайшла». Кампанія Casinos Austria так і не здолела прабіцца на беларускі рынак. А Эрвін Рот мае намер перадаць скандальныя дакументы ў пракуратуру, якая ўжо шчыльна займаецца сакрэтным рахункам НАК Аўстрыі. Што да беларускіх падаткаплатнікаў, то яны, мяркуючы па ўсім, не выдаткавалі на Лукашэнкаў адпачынак у Альпах ні капейкі. Іншая рэч — наколькі такі спосаб пошуку спонсараў для канікулаў адпавядае статусу кіраўніка незалежнай краіны.

**Алесь Кудрыцкі**

## Аўстрыйскі капітал у Беларусі

**1. «Velcom».** Акцыі мабільнага аператара трапілі ў рукі аўстрыйцаў праз Кіпр. Спачатку ў жніўні 2007 года Беларусь прадала дзяржаўныя 51% акцый прадпрыемства «Мабільная лічбавая сувязь» кіпрскай «SB Telecom» за $300—500 мільёнаў. Але ўжо праз некалькі месяцаў Telecom Austria Group перакупіла 70% акцый Velcom, заплаціўшы нашмат даражэй — мільярд даляраў. Цяпер гаворка ідзе і пра астатнюю частку акцый. Яны могуць быць выкупленыя аўстрыйцамі да канца года за 320 мільёнаў еўра.

**2. «Прыёрбанк».** У пачатку 2003 года аўстрыйскі холдынг Raiffeisen International Beteiligungs AG выкупіў 50% акцый банка. Кошт кантракта — 30,6 мільёна еўра. У далейшым доля аўстрыйцаў была даведзеная да 87,74%.

**3. «Мотавела».** Інвестыцыйнае фіяска. Аўстрыйская кампанія АТЕС выкупіла завод у 2007 годзе менш чым за $10 мільёнаў. Апошнім часам інвестар сутыкнуўся з фінансавымі цяжкасцямі. Месяц таму першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка з сумам канстатаваў, што «Мотавела» спыніцца.

**4. Шклозавод «Ялізава».** Завод на Магілёўшчыне дастаўся той самай аўстрыйскай АТЕС ад канадцаў у 2001. Пільную ўвагу кіраўніцтва Беларусі менавіта да гэтай адносна невядомай аўстрыйскай кампаніі тлумачыла расійскімі каранямі бізнэсу.

**5. Дрэваапрацоўчы завод.** Аўстрыйская кампанія Kronospan Holding Limited хоча ўкласці 150 мільёнаў еўра ў стварэнне вытворчасці ў Беларусі. Прапанова месячнай даўніны атрымала ўхваленне ўладаў.

Усяго ж у 2009 годзе ў Беларусі было зарэгістравана 18 прадстаўніцтваў аўстрыйскіх кампаніяў і 69 прадпрыемстваў з удзелам аўстрыйскага капіталу.

**Яўген Васількоў**

**Краіны-лідэркі па інвестыцыях у Беларусь па выніках 2009**




Аўстрыйскае партфоліё ў Беларусі: «Velcom», «Прыёрбанк» і «Мотавела».

**Замежны гандаль Беларусі і Аўстрыі**

| | |
|---|---|
| 2007 | $205 мільёнаў |
| **2008** | **$254 мільёнаў** |
| 2009 | $170 мільёнаў |

Крыніца: Белстат

# Алімпія: дзялок памёр, жыве дзялок!

**Хуан Антоніа Самаранч блаславіў шлюб капіталу і алімпійскага духу. З'явіліся на свет і дзеткі — Нацыянальны алімпійскі камітэт Аўстрыі і кампанія Casinos Austria. Рэдакцыйны каментар аўстрыйскай газеты Die Presse.**

Хто жадае зарабіць сапраўды шмат грошай, мусіць прыдумаць новую рэлігію. Алімпійскі рух акурат і ёсць такім стабільна прыбытковым веравызнаннем. З догмамі (справядлівасць, аб'ектыўнасць), рытуаламі (Алімпійскія гульні), ахвярадаўцамі (спонсары) і клірам (сябры Міжнароднага алімпійскага камітэта), які старанна ахоўваюць сваю рэлігію ад усялякай крытыкі. Пастановы ex cathedra (рэгулярныя сесіі МАК) абвяшчаюцца беззаганнымі і беспамылковымі.

Хуан Антоніа Самаранч (1920—2010 г.) на працягу 1980—2001 г. іграў ролю алімпійскага Папы. У часы іспанскага дыктатара Франка ён ператварыўся з апартуніста ў дыпламата і з дапамогай агента КГБ Уладзіміра Пуціна і галасоў з Усходняга блока абраўся прэзідэнтам МАК. Яго папярэднік, амерыканец Эверы Брэндэдж, трымаў МАК, нібы той кляштар, у адасобленасці ад свету.

Самаранч завязаў сувязі з кіраўнікамі дзяржаваў, ААН і сусветных канцэрнаў, а таксама падвысіў прыбыткі ад тэлерэкламы і аб'ёмы спонсарскіх ахвяраванняў з плюс-мінус нуля да больш чым двух мільярдаў доляраў за Алімпіяду. Акрамя гэтага, ён перашкодзіў Зальцбургу прыняць зімовыя Алімпійскія гульні 2014 г. Што было апошняй сумеснай акцыяй Самаранча і прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна.

У 1998 г. Самаранч запрасіў 75-гадовага Леа Вальнэра ў МАК. Кемлівы менеджэр кампаніі Casinos Austria з'яўляўся тым тыпам чалавека, які быў дужа даспадобы Самаранчу. Азы свайго майстэрства Вальнэр спасціг, працуючы дарадцам бундэсканцлера Ёзэфа Клаўса. Яшчэ да таго, як Клаўс прайграў выбары ў 1970 г., Вальнэр паспеў зрабіцца шэфам Casinos Austria і заставаўся на гэтай кіраўнічай пасадзе з 1968 па 2007 г. Ён здолеў ператварыць гэтую жабрацкую кантору ў найбуйнейшага падаткаплатніка Аўстрыі, які валодае храмамі азартных гульняў у многіх краінах.

Самаранч даверыў аўстрыйцу-паліглоту кіраўніцтва кантрольнымі камісіямі МАК, то бок скарбніцай. Працуючы ў МАК, Леа Вальнэр займеў кантакты з бізнэсоўцамі з Ізраіля, Аўстраліі, Ганконга і Сінгапура (і шматлікімі іншымі). Вельмі верагодна, што Casinos Austria выгадна скарысталіся з алімпійскага духу і яго сусветнай сеткі.

Магчыма, ідэя запрашаць да эканамічнага супрацоўніцтва такіх партнёраў, як беларускі дыктатар Аляксандр Лукашэнка, з'явілася ў нетрах самога МАК, які ўспрымае грошы і спорт не як супярэчныя элементы, а як спалучаныя сасуды. Нацыянальны алімпійскі камітэт Аўстрыі ў такім выпадку мог сыграць ролю кур'ера-інкасатара. Варта прызнаць, што глеба, на якой існуе НАК Аўстрыі (як і аўстрыйскі спорт у цэлым), шчодра ўвільгатнялася з лейкі прадпрыемстваў Вальнэра (казіно, латарэі, Lotto-Toto). Аднак, застаецца незразумелым, чаму Вальнэр (на якога, натуральна, распаўсюджваецца, як і на кожнага з нас, прэзумпцыя невінаватасці) выбраў такі патаемны і сумнеўны, а не сумленны і адкрыты шлях для таго, каб зmanwaбліваць саюзнікаў у сваю справу. Верагодна, яго метад спраўдзіў сваю эфектыўнасць. Але спартовым яго можна назваць толькі ў алімпійскім сэнсе.



Вальнэр, суўладальнік Casinos Austria.

# Аўстрыйскі эксперт: «Гэта быў шчодры прыём»

«НН» датэлефанавалася да Эрвіна Рота, эксперта, які даследуе акалічнасці паездкі Аляксандра Лукашэнкі ў Альпы ў 2002 годзе. Рот падкрэслівае, што скандал выклікаў не столькі сам факт візіту беларускага кіраўніка, колькі тое, што аўстрыйскі бок пайшоў на відавочныя махінацыі, каб яго арганізаваць.

**«НН»: Як Вы здолелі сабраць гэтыя дакументы?**

**Эрвін Рот:** Я ўжо 30 год працую спартовым журналістам, і, як кажуць аўстрыйцы, добра ведаю, як бегае заяц. Я выпадкова натрапіў на паведамленне прэсавага агенцтва APA ад 18 сакавіка 2002 г. пра візіт Аляксандра Лукашэнкі, а таксама прачытаў матэрыялы рэвізіі НАК Аўстрыі ў часопісе «Profil». Я прааналізаваў абедзве публікацыі, і, фігуральна кажучы, спаймаў зайца за хвост. Ну і пачаў разблытваць гэты клубок.

**«НН»: Як Вы лічыце, чым было запрашэнне Аляксандра Лукашэнкі ў Альпы для аўстрыйскіх арганізатараў візіту — поспехам ці марнаваннем грошай?**

**ЭР:** Пра гэта меркаваць цяжка, я гэтым пытаннем не займаўся. Casinos Austria, наколькі я ведаю, не заключыла ніякага пагаднення з беларускім бокам. Але калі паглядзець на ўсё з шырокай перспектывы, то запрашэнне, магчыма, было цалкам паспяховым. Аўстрыйскія манапалісты са сферы азартных гульняў цікавяцца доўгатэрміновымі перспектывамі выхаду на новыя рынкі. Дзякуючы візіту Аляксандра Лукашэнкі іх пазіцыі, у любым разе, палепшалі.

**«НН»: Але ці ёсць прамыя доказы таго, што гэтыя грошы сапраўды непасрэдна выдаткоўваліся на адпачынак кіраўніка Беларусі?**

**ЭР:** Яго імя стаіць на квітанцыях. На лыжным курорце Зээфельд у Тыролі ёсць пяцізоркавы гатэль Klosterbrau (у гэтым мястэчку, дарэчы, таксама ёсць казіно, якое належыць кампаніі Casinos Austria). І там, напрыклад, у спісе наведнікаў стаіць імя прэзідэнта Лукашэнкі. Больш за тое, у гатэлі ёсць кніга наведнікаў, і прэзідэнт Лукашэнка зрабіў у ёй асабісты запіс. Ён быў там, са сваімі сынамі, з разнастайнымі набліжанымі асобамі ў складзе вялікай дэлегацыі.

**«НН»: Што Вы можаце сказаць пра выдаткі на прыём кіраўніка Беларусі?**



На адпачынку Лукашэнка атрымаў траўму ў часе катання на лыжах, і яго давялося на верталёце вывозіць з горнага схілу.

**ЭР:** Выдаткоўваць на прыём такой дэлегацыі каля 200 000 еўра — гэта ўжо досыць незвычайна. У выдаткі, напрыклад, быў уключаны прыватны авіяпералёт паміж Венай і Інсбрукам. На адпачынку спадар Лукашэнка атрымаў траўму ў часе катання на лыжах, і яго давялося на верталёце вывозіць з горнага схілу. Гэтыя выдаткі таксама былі аплачаныя аўстрыйскім бокам. Гэта быў шчодры прыём. Але хачу падкрэсліць, што, калі казаць пра вашага прэзідэнта, то для яго гэта была проста звычайная паездка. А вось што выклікала рэзананс у Аўстрыі, дык гэта тое, што аўстрыйскі бок аплачваў яе, карыстаючыся патаемнай бухгалтэрыяй, бескантрольна. Спадара Лукашэнку можна было запрасіць прыватна, але, відавочна, аўстрыйскія арганізатары паездкі хацелі нешта прыхаваць. Хоць гэта вельмі незвычайна, што такая арганізацыя, як Нацыянальны алімпійскі камітэт Аўстрыі, выдаткоўвае больш за 200 000 еўра за візіт, да якога сам НАК афіцыйна не мае ніякага дачынення. Бо падрыхтоўку паездкі здзяйсняў не НАК Аўстрыі, а дырэктар Casinos Austria спадар Шкоф. Грошы проста праводзіліся праз рахунак аўстрыйскага НАК, каб схаваць гэты факт. А гэта ў нашай краіне ў высокай ступені супрацьзаконна.

**«НН»: Але чаму аўстрыйцам спатрэбілася такая схема?**

**ЭР:** Вакол НАК Аўстрыі ўжо доўгі час выспявае скандал, звязаны з незалежнай (у двукоссі) камісіяй, якая праводзіла рэвізію гэтай структуры. Гэтая камісія зрабіла выснову, нібыта Леа Вальнэр, які ў той час быў прэзідэнтам НАК Аўстрыі, нічога не ведаў пра махінацыі. А я хацеў на аснове інфармацыі пра гэты візіт давесці, што Вальнэр быў вельмі глыбока ўцягнуты ў гэтыя справы, што ён асабіста быў ініцыятарам запрашэння і што менавіта ён вырашыў праводзіць грошы па-за афіцыйнай бухгалтэрыяй.

**«НН»: А як Вы асабіста ставіцеся да таго, што ў наш час бізнэс, спорт і палітыка ўсё больш і больш пераплятаюцца?**

**ЭР:** Гэтая сувязь не вядзе да дабра. Запрашаць Аляксандра Лукашэнку ва ўмовах, калі дзейнічала пастанова ЕС, якая не дазваляла мець з ім справы на афіцыйным узроўні ні дзяржавам Еўрасаюза, ні іх афіцыйным прадстаўнікам, — на гэта грамадскасць Аўстрыі паглядзела б вельмі крытычна. Таму Леа Вальнэр, відавочна, хацеў захаваць у таямніцы тое, што ён збіраецца сустрэцца са спадаром Лукашэнкам.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**



Тыроль — зімовы рай Еўропы.



Раскоша гатэля Клёстэрброй...



...дзе спыняўся Лукашэнка.



# Шпіёнская сталіца Еўропы

Паваеннае развіццё падзеяў і геаграфічнае становішча дапамагло Вене заваяваць тытул шпіёнскай сталіцы Еўропы.

Падобна да Берліна, пасля другой сусветнай Вена (як і ўся Аўстрыя) была падзеленая на брытанскую, французскую, амерыканскую і савецкую акупацыйныя зоны. Былыя нацысты, згаладалыя мясцовыя жыхары і ўцекачы з Усходняй Еўропы, намагаючыся выжыць у паваенным безграшоўі, спрабавалі прадаць каштоўныя веды любому, хто мог заплаціць. Шпіёнскае жыццё, поўнае інтрыг і вярбовак, у Вене буяла.

Пасля вываду савецкіх войскаў у 1955 г., у Вене засталося вялізнае савецкае пасольства, напакаванае супрацоўнікамі КДБ і ГРУ (савецкай вайсковай выведкі). У тыя гады ЦРУ паведамляла, што амаль кожны, хто быў абвінавачаны ў шпіянажы на карысць СССР, хоць раз ды ездзіў у Вену на сустрэчы са спецслужбамі. Савецкія дыпламаты, якія працавалі ў Вене ў 70-я і пасля ўцяклі на Захад, гаварылі пра добра наладжаную шпіёнскую сетку ў аўстрыйскай сталіцы. Сярод іх — былы агент ГРУ Віктар Сувораў, які ў сваіх белетрызаваных успамінах «Акварыум», выдадзеных на Захадзе, падрабязна апісаў, як яго вучылі сыходзіць ад сачэння ў аўстрыйскай сталіцы. Па словах Суворава, каля 80% усіх савецкіх грамадзянаў у Вене (гандлёвыя працаўнікі, навукоўцы, прадстаўнікі «Аэрафлота» і вялікая колькасць дыпламатаў), акрамя сваіх непасрэдных абавязкаў, выконвалі «іншую працу». Большасць заданняў, паводле словаў Суворава, была сфакусаваная на прыдбанні заходніх тэхналогій.

Халодная вайна скончылася два дзесяцігоддзі таму, а Вена дагэтуль застаецца магнітам для шпіёнаў. Адным з самых гучных злачынстваў апошняга часу, за якімі праглядаюцца сляды дзейнасці спецслужбаў, было забойства чачэнскага дысідэнта Умара Ісраілава, які быў застрэлены пасярод белага дня на пачатку 2009 г. у Вене. Аўстрыйская паліцыя затрымала трох чалавек, якія падазраюцца ў арганізацыі замаху: двух чачэнцаў і аднаго аўстрыйца на прозвішча Кальтэнбрунэр, які быў народжаны ў СССР.

У 2008 г. была здзейсненая спроба выкрадання былога кіраўніка спецслужбаў Казахстана Альнура Мусаева, экстрадыцыі якога даўно дамагаецца рэжым Нурсултана Назарбаева. І Ісраілаў, і Мусаеў жылі ў Вене ў выгнанні. Паводле расійскай рэдакцыі радыё «Свабода», у Вене дзейнічаюць не менш за 500 агентаў ФСБ, якія сочаць за шматтысячнай чачэнскай дыяспарай, якая прыбыла ў Аўстрыю ў апошнія гады.

«Аўстрыя па-ранейшаму ўлюбёнае месца для агентаў, — кажа Зігфрыд Беер, кіраўнік Аўстрыйскага цэнтра па пытаннях выведкі, тэрарызму і бяспекі пры ўніверсітэце гораду Грац. — Улады, як правіла, ведаюць пра іх, але ўмешваюцца зрэдку... Гэта такая даўняя завядзёнка». Да таго ж, лічыцца, што ў Вене «досыць лёгка здабыць зброю і адмываць грошы». Не забудземся і на геаграфічнае становішча Вены, якая знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў — усяго 56 км да сталіцы Славакіі Браціславы і якая гадзіна язды ад венгерскай мяжы.

**ЛК**

# Пацёмкінскія Янукі

**Пры канцы красавіка ў Беларусь прыедзе Віктар Януковіч. На ўсякі выпадак рыхтуюцца да візіту і ў вёсцы Янукі Докшыцкага раёна, адкуль паходзіць Януковічаў дзед.**

Ад маёй вёскі Завараты, што ў Глыбоцкім раёне, да Янукоў каля дзесяці кіламетраў. Паехалі мы на роварах, бо іншай тэхнікай тут праехаць складана: дарога ідзе па тэрыторыі трох раёнаў, а між раёнамі дарог у нас амаль няма.

На шляху сустрэлі толькі двух чалавек (адзін з якіх ляжаў п'яны пры дарозе) і адзін аўтамабіль — вёз рабочых з Янукоў.

Наша мясцовасць ляжыць на мяжы Глыбоцкага, Пастаўскага і Докшыцкага раёнаў, раней гэта была адна адміністрацыйная адзінка. Зараз паўсюль пануе запусценне, у большасці вёсак жыве чалавек па дзесяць.

Праходзіць тут самы грэбень Свянцянскай грады, па якой пралягае водападзел паміж Нёманам і Дзвіной. Мясціны прыгожыя, але землі не вельмі ўрадлівыя. Таму тут і былі ў асноўным невялікія вёскі, але недалёка адна ад адной. Да райцэнтраў далекавата, гэта адна з галоўных прычын, чаму людзі адсюль з'язджаюць.

У вёсцы Струкі, якая да 1960-х была цэнтрам сельсавета, зараз жылая толькі адна хата. Наступная за ёй вёска — Янукі. Ужо на пад'ездзе да яе чуваць гуд тэхнікі, у паветры стаіць чад.

Непадалёк ад скрыжавання з докшыцкай дарогай экскаватар і бульдозер прыбіраюць рэшткі фермы. Пад'язджае начальнік забіраць механізатараў, цікавіцца, хто такія, чаго фатаграфуем. Мы ж пытаемся, ці чакаюць яны высокага госця з Украіны. «Прамога ўказання няма, але на ўсякі выпадак рыхтуемся», — адказвае.

> «Прамога ўказання няма, але на ўсякі выпадак рыхтуемся».

Ад скрыжавання да Янукоў два кіламетры, тут дарога раўняная грэйдэрам, бялеюць свежыя пні зрэзаных дрэў, дымяцца кучы галля. На могілках, проста вакол пахаванняў, чарнее спаленая трава, месцамі стаіць абгарэлы ядловец.

— А хто гэта так тут усё папаліў? — пытаюся ў мясцовага жыхара.

— А былі тут з сельсавета...

За падпал сухой травы можна атрымаць штраф да 40 базавых, але начальства, відаць, гэта не тычыцца.

У Януках я не быў паўгода, змены адразу кідаюцца ў вочы. Паўразваленыя хаты зламалі, экскаватар закопвае падмуркі. Павыразаныя здзічэлыя слівы, падрэзаныя яблыні ў закінутых садах.

У першай ад дарогі хаце ніхто не жыве, аб чым сведчаць адарваныя драты электраперадач. Але вокны і калодзеж свежапафарбаваныя, на вокнах новыя фіранкі.

Мясцовая жыхарка Марыя Януковіч сустракае насцярожана: «Надакучылі тут ужо ездзіць і фатаграфаваць». «То чужыя надакучылі, — кажу. — А мы ж мясцовыя, таксама хочам пабыць у цэнтры падзей». «А што тут такога, проста наводзяць парадак», — кажа яна. На цётцы Марыі куртка з надпісам Ukraine і з украінскім трызубам. Спадарыня Марыя дзякуе Януковічу, што хоць нейкі тут навялі парадак, праўда, у адраджэнне Янукоў, у якіх жыве зараз два чалавекі, не верыць.

Варта адзначыць, што сам Віктар нарадзіўся не ў Януках, адсюль толькі яго дзед, які выехаў на заробкі ў Данбас яшчэ ў 1914 годзе. На Янукоўскіх могілках пахаваны прадзед Януковіча, праўда, месца пахавання яго невядомае. Але ж прозвішча ва ўкраінскага прэзідэнта ўсё адно наша, беларускае, і тутэйшыя жыхары гэтым вельмі ганарацца. «Хоць нехта з нашых выбіўся ў людзі», — кажуць яны.

**Зміцер Лупач,**
**фота Кастуся Шыталя**



**На ўказальніку — ці то кіламетраж, ці то лічба жыхароў.**


**Янукі. Экскаватарам закопваюць падмуркі разбураных хат.**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### За праўладнага кандыдата агітавалі непаўналетнія?

**Я — Кумец Уладзімір Уладзіміравіч, кандыдат у дэпутаты Мінскага гарсавета па Васняцоўскай акрузе №5.**

20 красавіка я выехаў у сваю акругу, каб расклеіць і раздаць агітацыйную прадукцыю. Побач з перадвыбарным стэндам каля ўнівермага «Беларусь» ужо размясціліся актывісты БРСМ і іх правадырка. Улёткі прывёз мужчына ў касцюме, пад'ехаўшы на грузавіку проста да стэнда.

Агітавалі за праўладнага кандыдата, нам. галоўнага лекара Чайкоўскую Галіну Вікенцьеўну. У пікеце ўдзельнічалі 6 дзяўчат, якім на выгляд і 16 гадоў не дасі, а, як вядома, агітаваць за кандыдата могуць толькі паўналетнія. Я вырашыў папрасіць у іх пашпарт, але адказам было маўчанне.

**Уладзімір Кумец, Мінск**

### Людзі думалі — паштоўкі з выканкама

**Нядаўна ў нас у Оршы нейкія хлапцы раздавалі мінакам паштоўкі з тэкстам.** На адным баку надпіс «Гавары праўду!», на адваротным — чыстае месца для пісьма і адрас Адміністрацыі прэзідэнта. Людзі ахвотна бралі паштоўкі. Мне дасталіся толькі дзве, а хацелася болей. Адправіўшы паштоўкі, я вырашыў пазваніць у ідэалагічны аддзел Аршанскага гарвыканкама і сардэчна падзякаваць ініцыятарам акцыі.

> Якую яшчэ праўду? Гэта ўсё падкопы дэструктыўных элементаў!

—Паштоўкі? Якія паштоўкі? Якую яшчэ праўду? Гэта ўсё падкопы дэструктыўных элементаў! — гнеўна абураўся добра пастаўлены голас.

Вось як выходзіць — калі хочаш сказаць ці пачуць праўду, значыць, табе адна назва — дэструктыўны элемент.

**Юры Патапаў, Балбасава**

### Ментальнасць начальства

**Старое Гродна працягваюць разбураць.** Прычыну трэба шукаць у расійскай, усходняй ментальнасці начальства. Еўрапейскі горад — інтэр'ерны, прастора вакол жыхара агароджана будынкамі, апрача неба над галавой. Пляцы ў еўрапейскім горадзе забудаваныя з усіх бакоў і існуюць для збору грамадзянаў або як рынкі. Усходні пляц — гэта вольная ад забудоў прастора ў горадзе, дзе знаходзіцца рэзідэнцыя цяперашняга ўладара і дзе стаіць помнік пачынальніку дынастыі, з якой паходзіць уладар. З гэтага пляца павінны быць бачны гарызонты неабсяжнай краіны і на гэтым пляцы павінны адбывацца вайсковыя парады з удзелам сланоў або танкаў.

> На гэтым пляцы павінны адбывацца парады з удзелам сланоў або танкаў.

Мне казалі, што гадоў сорак таму гродзенскія ўлады меліся зруйнаваць на Савецкім пляцы Фарны касцёл, каб з пляца былі відаць коміны прадпрыемства «Азот». Цяперашнія кіраўнікі Гродна высеклі дрэвы на пляцы, якія выконвалі тую ж функцыю, што раней палац Радзівілаў, і раскрылі прастору з комінамі нейкага завода.

Пакуль мысленне нашых чыноўнікаў і архітэктараў будзе не беларускім — нашы старыя гарады будуць разбурацца.

**Алесь Ступень, Гродна**

### Чаму хваляць Гітлера

**Надоечы гаманіў з вяскоўцам сярэдняга веку — ён горача хваліў Гітлера.** Аніякія рацыянальныя тлумачэнні процілеглага яго не пераконвалі. І гэта не адзінкавы выпадак.

Мая працоўная гіпотэза: Гітлер разглядаецца падсведама як носьбіт помсты, як die letzte Hoffnung (ням. «апошняя надзея»). Мужчына дужа адмоўна характарызаваў уладу і начальства. А што кажуць навукоўцы на гэты конт, пра ўстойлівае ўяўленне пра гэнага нягодніка як мсціўца за пакрыўджаных? Цікавы феномен, бо і Лукашэнка з тых жа стыхійных нізоў. І ягоная пахвала Гітлеру мае той жа ірацыянальны характар.

**Мікола Бусел, Дуброва, Светлагорскі раён**

### Усё ад малапісьменнасці

**У аўтобусе цётухна пытала ў пасажыраў, ці ведаюць яны, як пабеларуску «не отвлекайте водителя во время движения».** Калі ніхто не змог даць адказу, сказала сама: «Не адваблівайце ўвагу». Этымалогія раскрывалася наступным чынам: вабіць — «привлекать», адвабіць — «отвлекать».

Сам я ў спрэчку не палез (хаця меў варыянт: «Не замінайце кіроўцу падчас руху»). Многія інтуітыўна разумелі, што спадарыня вярзе лухту, але парыраваць не маглі.

Мова фактычна ігнаруецца дзяржавай, амаль не гучыць у публічным ужытку, вось і чуеш такія абсурдныя дыялогі ў сталіцы Беларусі.

**Чытач, gmail.com**

### Да 70-годдзя Алеся Марачкіна

Каб родны кут у вяках не згас,
Ёсць мара — Марачкін у нас.
Беларусь на свет увесь
Шаноўны славіць наш Алесь.

**Анатоль Кісель**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## ФЕЛЬЕТОН

### Што за парода — зялёныя парасяты?

Вось і прайшлі выбары ў мясцовыя саветы. Многа вучоных людзей выставіла кандыдатуры. Дык у нас таксама двое абіраліся.

Адзін — загадчык свінакомлексу. У нас аграгарадок, дык пабудавалі велізарны свінакоплекс на тысячы парасят. А загадчыка з вобласці прыслалі, свайго такога разумнага не знайшлі. Дужа сціплы чалавек. Як прыехаў, далі яму новы домік, яны ў нас пустуюць, дык ён адмовіўся. Гэта для маладых спецыялістаў, кажа, я займаць не буду. Лепш новы пабудую.

І паставіў такі гмах — вока радуецца. І не скнара: да яго за парсюкамі і з раёна, і з вобласці прыязджаюць. Толькі і гойсаюць туды-сюды дарагія іншамаркі. І днём, і ноччу адгрузіць, нават трохі танней аддасць, і не трэба ў кантору бегчы, каб аплаціць: грошы на месцы возьме. А неяк выпіўшы быў, дык казаў нам, што ў Мінску (а ў яго там дзеці вучацца) ужо нашы парасяты не каціруюцца, толькі зялёнымі і бяруць. А мы ўсё гадалі, што гэта за такая парода новая — зялёныя парасяты?

А другі быў кандыдат — настаўнік. І дзеці яго любяць, і дарослыя паважаюць. Толькі дзіўны ён нейкі. Кажа: «Хачу, каб людзьмі звацца!» Пра што ён? Нас і без яго куды пазавуць, туды мы і ідзём.

Казаў, будзе спрыяць павышэнню пенсій. А куды нам болей? У старых пенсіі большыя, чым даярчын заробак на ферме. У многіх вунь дзеці ў горадзе работу пакідалі ды на матчыны пенсіі і жывуць. Ледзь магазіншчыца паспявае гарэлку завозіць.

Мы, канешне, настаўніку былі ўдзячныя за яго чулыя словы, толькі чужы ён нам, і старшыня так кажа. Галасавалі мы за загадчыка свінакомплексу. Ён набраўся: у яго і дом, і машына, і кватэра ў Мінску. Куды яму яшчэ? А настаўнік, як стане дэпутатам, дык пакуль абжывецца, зусім наш калгас збяднее. Кожны чалавек прагны. А як сам пасаромеецца браць, старэйшыя прыяцелі навучаць. Загадзя мы яго ўратавалі сваім недаверам. На аднаго хабарніка ў краіне будзе менш.

**В.Жураўскі, Гродна**

## ВОДГУКІ НА NN.BY

### Пра Кіргізію

Нічым не грэбуе Расія — права дужага. Але тут крывая яе нікуды не вывезе — прэзідэнт законны.

**Колхозный бандит**

### Верш пра нафту з Венесуэлы

У танкера ўжо — Буга траверс,
а ў трумах — вось вам на! —
замест нафты — Уга Чавес
і ўся ягоная шпана.

Ну, а потым, без мандата,
пад пакрывам, уначы —
«борт» з Гаваны: камандантэ
(ці ягоныя машчы).

Усё заблытаў і папутаў!
Перад гэтым наш АМАП
выкрадзе найперш Мабуту
із варожых чорных лап.

— Ты забыўся пра Махмуда! —
выкрываць з нас кожны рады.
Толькі зваць да нас не буду
Ахмадзеніжада.

Бо ён надта налызоны —
гэты нізенькі пацан:
із чарнобыльскай, із зоны,
пазбірае ўвесь уран.

**Кнехт**

### Пра ідэю Лябедзькі, каб апазіцыя актывізавала расійскі вектар

Сягоння ніякі рэальны палітык постсавецкай прасторы не абыдзецца без Расіі (16 год кіравання Лукашэнкі — таму яскравае пацверджанне). Тым болей, што ў Еўрасаюз мы заўтра не ўступім. Лябедзька, дарэчы, не заклікае «паўзці ў Расію на каленях», а прапануе запоўніць негатыў у адносінах з усходнім суседам, які стварыў сваёй спекулятыўнай палітыкай і бабскім языком «прэзідэнт» Беларусі. Правільна робіць Анатоль! Трэба жыць не за кошт Расіі, але ў супрацоўніцтве. А то дажыліся — палохаем свет «бруднымі бомбамі», каб толькі на нас звярнулі ўвагу...

**Кнехт**

* * *

Калі ў будучыні ўлада будзе ставіцца па-іншаму да грэка-каталікоў, тады можна будзе паставіць пытанне пра вяртанне царквы Святога Духа ў сталіцы, якую цяпер адбудоўваюць у якасці дзіцячай Філармоніі.

**м2**

### «Нацыянальнасць — чалдон» (№15)

Этнічная група кітайцаў, якая вызнае іслам, вызначылася як асобная і ў СССР. Іх частка жыве ў Цэнтральнай Азіі і вядомая як дунганы. З беларусамі іх лучыць наяўнасць у алфавіце літары «ў нескладовае».

**с-богдан**

# Абы Не Было Вайны — 2

**Падчас прагляду фільма Мікіты Міхалкова «Стомленыя сонцам−2» апаноўвае сапраўдная боязь мінулага.**

Вось яны сядзяць з папкорнам і снікерсамі. Нядзельны прагляд. А перад імі так рэалістычна салдатаў топчуць танкі, людзей разрывае на кавалкі выбухамі, гараць у пунях жывыя вяскоўцы.

Не здымаючы моднае 3D, Міхалкоў гэты эфект прысутнасці вынайшаў і так. Ці то вельмі блізкая камера, ці то мітусня ўваччу, ад якой асэнсаваць нічога немагчыма — як падчас сапраўднай вайны. Ці то вялізная порцыя крыві і наматаных на гусеніцы кішак. Выснова: страшна быць на вайне. І вусцішная цішыня ў галаве пасля прагляду. Аніводнай жывой думкі.

Калі што заўважаеш, дык выбрыкі рэжысёра: нямецкія танкі з мачтамі (!), на якіх трапечуцца ветразі са свастыкай. А што там герой першай часткі, Іосіф Сталін? Тэма Сталіна ізноў раскрытая: тырана камічна апускаюць у торт з выявай яго самога. Толькі пазнакай сцэнарыста: «З калекцыі сноў камдыва Котава, якія ён прысніў у Гулагу».

Са «Стомленых сонцам-2» атрымалася новае пакаленне культурнай прадукцыі тыпу «Абы не было вайны»: як добра, што мы цяпер, а яны тады. Як добра, што ў нас няма гэтага, з пекла ды ў прысак, выбару: Гулаг або штрафбат.

Падчас прагляду апаноўвае сапраўдная боязь мінулага і радасць за цяперашнюю ўтульнасць. Які б ні быў палітычны рэжым, які б ні быў эканамічны стан — галоўнае вайны няма. І адзіная думка, што нараджаецца: «Дзякуй Табе, Божа, што я нарадзіўся пазней». І пасля ад страху хочацца ўсіх і ўсё забыць, забыць...



Так, цяжка рабіць разумнае кіно ў краіне, дзе рэакцыяй на самае мяккае слова супраць дзеянняў СМЕРШа можа быць: «Ты што, фашыст?» І Міхалкоў у чарговы раз выявіўся мудрым кінематаграфічным салдатам: ён ішоў сцежкамі дасведчаных сапёраў і ні разу не памыліўся. Нават поспехі стужкі — жыццёвыя замалёўкі: маладзенькі танкіст, што канае пад Сталінградам, што просіць санітарку паказаць грудзі, або пагрозлівае тахканне гадзіннікаў на руках забітых пад Масквой салдатаў, — усё губляецца на фоне неабдымнага і непад'емнага палатна мудрага печкура Міхалкова. А нам застаецца толькі страх умоўнага ладу за сябе, каштоўных: «А як бы я меўся ў акопах пад агнём?»

Праз 65 гадоў на Заходнім фронце без перамен.

**Ліза Кавальчык**

# Ганна Хітрык: Хачу і пяю

**Гурт «Дзецідзяцей» запісаў першы альбом па−беларуску.**



«Рух» — такая назва альбома — складаецца з 14 песняў. У іх ліку — дзве новыя: «Нічога» і «Падлетак». А таксама старыя белмоўныя хіты: «Раптам», «Гімн моладзі» ды «Івона» — самая першая песня гурта. Тут і фолк, і лірычныя мелодыі, і гімны, а да пухкага акустычнага гучання «Дзецідзяцей» дадалася шчыльнасць электрычных гітараў.

Салістка гурта Ганна Хітрык кажа, што не падзяляе сваю творчасць на розныя мовы: «Проста хацелася мець усе гэтыя песні на адной кружэлцы». І дадае, што натхняюць на складанне песняў людзі, рэчы і творы, і ў прыватнасці тэатральная пастаноўка Translations, дзе з любоўю і болем апісаная маленькая краіна Ірландыя і яе праблемы.

«Я не Анджаліна Джолі, каб усюды свяціцца, — кажа салістка, а па сумяшчальніцтве акторка Купалаўскага тэатра і кінаактрыса Ганна Хітрык. — Але сапраўды: пастановак у тэатры мне недастаткова. Да таго ж эпітэт «акторка кіно» хоць і гучыць натхняльна, аднак у рэчаіснасці я здымаюся не так шмат, як хацелася б. Так што, хачу і пяю. З іншага боку, калі я здымалася ў камедыі «Дастыш фантастыш», у мяне і ў думках не было сказаць рэжысёру Аляксандру Канановічу пра свае песні. Ён жа ведае мяне як акторку, а не як спявачку».

«Дзецідзяцей» прэзентуюць альбом 4 мая на сцэне Купалаўскага тэатра. Усё будзе сціпла: ніякіх спецыяльных гасцей, ніякіх артыстычных перфомансаў. «Нам не хочацца, каб людзі ішлі на наш канцэрт у Купалаўскім як на нейкае тэатральнае шоу,— дадае Ганна Хітрык. — Мы шчыра адспяваем свае песні на сцэне ўлюбёнага тэатра, пакінуўшы ўбаку ўсю тэатральнасць і манернасць». У дзень прэзентацыі «Рух» паступіць у дыскарні.

**Лявон К**

GAZETABY.COM

## Сціпла

• **Барадулін выдаў «Халодную памяць вады».** 25 красавіка ў мінскім касцёле Святых Сымона і Алены адбылася яе прэзентацыя. У 452-старонкавым ілюстраваным выданні — новыя вершы паэта, напісаныя на пачатку XXI стагоддзя. Дапамог выдаць кнігу Чырвоны касцёл, дзякуючы спрыянню якога за апошнія пяць гадоў выйшла дзевяць зборнікаў паэта.

• **«Дзеянні Святых Апосталаў» па-беларуску.** Выйшла ў свет кніга «Дзеянні Святых Апосталаў» у перакладзе на беларускую мову Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы. Гэта ўжо 5-я кніга серыі «Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста» з паралельнымі тэкстамі на чатырох мовах: грэцкай, царкоўнаславянскай, расійскай і беларускай. Пазнаёміцца з выданнем можна ў кнігараньцы Свята-Петрапаўлаўскага сабора (Мінск, вул. Ракаўская, 4).

• **Крымінальнай справы за «Пагоню» не будзе.** Транспартная міліцыя, якая праводзіла следства па факце знішчэння ўнікальнага комплексу вітражоў падчас рэканструкцыі будынка віцебскага чыгуначнага вакзала, ніякіх парушэнняў не знайшла. Крымінальная справа заводзіцца не будзе. Вітражы знішчаныя будаўнікамі. Але аднаўленне магчымае: у аўтара вітражоў, 75-гадовага мастака Вікенція Ральцэвіча, захаваліся ўсе распрацоўкі, тэхнічныя падлікі ды эскізы знішчанага комплексу з «Пагоняй».

• **У Нью-Ёрку з'явіўся бюст Васіля Быкава.** Ідэя паставіць помнік належыць беларускай дыяспары Амерыкі. Бюст быў усталяваны 21 красавіка ў бібліятэцы Калумбійскага ўніверсітэта Low Memorial Library. У адкрыцці ўзялі ўдзел аўтар бюста — скульптар Алесь Шатэрнік ды старшыня Беларускага інстытута навукі і мастацтва, патрыярх беларускай дыяспары Вітаўт Кіпель.

• **Мінкультуры пачало конкурс фільмаў на нацыянальную тэматыку.** Маладзёжны конкурс на стварэнне сцэнарыяў дакументальных фільмаў, сацыяльных ролікаў, прысвечаных нацыянальнай тэматыцы, аб'яўляе Міністэрства культуры. З умовамі конкурсу можна азнаёміцца на сайце kultura.by. Падвесці вынікі плануецца падчас Дня беларускага кіно 17 снежня.

**ЛК, КМ**

# Прэм'ера паводле Алеся Адамовіча

**29 красавіка ў Купалаўскім тэатры прэм'ера — драма «Не мой». Яна пастаўленая паводле аповесці Алеся Адамовіча «Нямко». Расказвае рэжысёр спектакля Аляксандр Гарцуеў.**

**«НН»: Ці ж купалаўскі «Не мой» улічвае досвед сумеснай беларуска-нямецка-расійскай кінастужкі «Франц+Паліна», знятай паводле таго самага твора, і ці ёсць у пастаноўцы элементы кінематографа?**

**АГ:** Фільм пабачыць мне не давялося... «Не мой» — маштабная пастаноўка: больш за трыццаць удзельнікаў, шыкоўныя дэкарацыі Барыса Герлавана. Будуць спецэфекты. Магу адкрыць таямніцу, што дэкарацыі будуць гарэць, там мы ўжываем нашае купалаўскае ноу-хау, эфектнае, але бяспечнае.

**«НН»: Наколькі ваша пастаноўка блізкая да арыгінала, аповесці Алеся Адамовіча «Нямко»?**

**АГ:** Мы дадалі новыя лініі. Маці і бацькі Франца, якія з'яўляюцца яму ў снах. Але лічу, што Адамовіча я не сказіў. Ён пісаў пра гэтае каханне, што руйнуе межы і бар'еры. На прэм'еру я запрасіў дачку Адамовіча, Наталлю, і мне не будзе сорамна за пастаноўку. Пагатоў яна выступіла ў ролі кансультанта, бо дасканала ведае бацькаву творчасць.

**«НН»: Чаму назва пастаноўкі па-расійску, а не па-беларуску?**

**АГ:** Хутчэй не «Немой», а «Не мой». Паводле сюжэта, калі пасля вайны кэдэбісты прыйшлі арыштоўваць бацьку Паліны, дык Франц, былы нямецкі салдат, які закахаўся ў беларускую дзяўчыну і дэзерціраваў, адчувае сваю бездапаможнасць перад імі і кажа: «Я — нямы». Потым успамінае расійскі адпаведнік «немой» (а расійскай мове яго навучыў бацька яшчэ ў Дрэздэне, да вайны). Франц пачынае гуляцца гэтым словам. «Я — не мой, я не твой, я — нічый». Тут як бы сама мова намякае на сітуацыю бездапаможнасці асобнага чалавека. Нагадаю, што ў вайну Франц, які забіў свайго камандзіра, і Паліна, у вачах многіх — сужыцелька варожага салдата, былі між двух агнёў: хаваліся і ад партызанаў, і ад немцаў. А ўвогуле, як і ў Адамовіча, у нас Франц спярша разумеецца з Палінай на каструбаватай расійскай, але потым, пад уплывам Паліны, пераходзіць на беларускую.

**ЛК**



# Перш аднавілі замак, пасля — краіну

**Пра падводныя камяні адбудовы рэзідэнцыі Вітаўта Вялікага ў Троках піша Алег Дзярновіч.**

Паводле легендарных звестак, сваю сталіцу ў Трокі (палітоўску — Тракай) з племяннога цэнтра Кернава (Паўночная Віленшчына) перанёс вялікі князь Гедымін. Гэта ўжо пасля ён канчаткова зробіць сваёй рэзідэнцыяй Вільню. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» апавядае, як у 1323 г. Гедымін «ехаў у глыбокія пушчы дзеля уцехаў і галоўных ловаў». Вялікаму князю «ўпадабаўся пляц» і ён загадаў ставіць там замак, «перакопам і валам вялікім абкружыўшы яго». Натхненне краявідамі іграла тут не галоўную ролю. У той час стратэгічнай задачай кіраўніцтва Вялікага Княства была пабудова лініі замкаў, каб процістаяць нападам крыжакоў. А нямецкія рэйды, у першую чаргу, скіроўваліся на землі Жмудзі і гістарычнай Літвы.

Ад Гедымінавых умацаванняў, вядомых сёння як Старыя Трокі, нічога не засталося на паверхні зямлі. Гэта археалагічны аб'ект, што знаходзіцца побач з мястэчкам.



Для літоўскай грамадскасці і наменклатуры адбудова замка стала дэманстрацыяй прэтэнзій на аўтаномію ў межах СССР.

## Уладанні Кейстута

У 1345—1381 гг. Трокі былі стаўкай вялікага князя Кейстута і, адпаведна, адным з цэнтраў *дыярхіі* — так можна акрэсліць сінкрэтычную палітычную сістэму Вялікага Княства ў тыя часы. Дзяржавай кіравалі два ўладары, адзін з якіх быў галоўнейшы — як у другой чвэрці XIV ст., пры Кейстуце, Альгерд. Пазней гэтая схема паўторыцца, напрыклад, у суіснаванні сыноў Альгерда і Кейстута — Ягайлы і Вітаўта. Падначалены манарх у такіх сістэмах паліталагічна называецца *субманарх*.

Троцкі замак Кейстута знаходзіўся на паўвыспе, на паўднёвым беразе возера Гальве, і складаўся з дзвюх частак. Непасрэдна да паселішча прымыкаў цагляны замак з шасцю ці сямю квадратнымі вежамі. Драўляны ж замак (Верхні), больш старажытны, далучаўся да мураванай часткі з поўначы і быў атачаны азёрамі Гальве і Бернардынскім (Лукас). Драўляны палац валадара стаяў у цэнтры Верхняга замка на пагорку, вядомым як Ахвярная гара — усё тут было прасякнута містычным духам балтаў. Угэтым палацы жыла Кейстутава сям'я, тут гадаваліся два будучыя вялікія князі — Вітаўт і Жыгімонт.

Пасля смерці Альгерда «старэйшым» князем мусіў быў стаць ягоны сын Ягайла. Але Кейстут быў значна старэйшы па ўзросту і не жадаў падпарадкоўвацца пляменніку. Дзядзька і пляменнік не ўтрымалі раўнавагі і пачалі крывавае змаганне за ўладу. Да яе, спачатку на баку бацькі, далучыўся Вітаўт. У канфлікце бралі ўдзел і крыжакі, дапамагаючы то аднаму, то другому боку, але пільнуючыся толькі ўласных інтарэсаў.

У 1382—1383 гг. Кейстутавы Трокі неаднаразова штурмавалі, бурылі і палілі. Таму пазней, у стабільныя 1414—1430 гады, Вітаўт ледзь не нанава адбудоўваў бацькоўскі кут. Пасля рэканструкцыі Верхні замак стаў мураваным, з трыма вежамі, а на цэнтральным пагорку пачалося будаўніцтва мураванага палаца адпаведнага вялікакняскаму статусу. Але ў той самы час быў збудаваны замак на выспе, сярод возера Гальве, таму будаўніцтва палаца так і не было скончанае. Магчыма, вырашылі не марнаваць час і сродкі на горш абароненае збудаванне. Рэшткі гэтага замка і сёння высяцца ў берагавой частцы Трок. Але візітоўкай горада стаў астраўны замак.

## Будавалі немцы, аздаблялі русіны

Вітаўт распачаў гэта будаўніцтва ў канцы XIV ст., і яно працягвалася ўсю першую палову XV ст. Замак быў пабудаваны з выкарыстаннем узораў сучаснай ордэнскай архітэктуры, пад уплывам французскага і нідэрландскага абарончага дойлідства. Гэта канвентгауз — замак рэгулярнай формы з комплексам жылых, сакральных і гаспадарчых пабудоў, згрупаваных вакол невялікага ўнутранага двара-дзядзінца. Ён падзяляўся на перадзамкавую (форбург) і рэзідэнцыйную часткі.

Чатырохкутная, амаль правільнай формы, рэзідэнцыйная частка з усіх бакоў была абнесеная мурамі, асобныя сцены ўмацаваныя кантрафорсамі. У цэнтры дзядзінца паралельна адзін аднаму пабудаваныя два трохпавярховыя, прастакутныя ў плане, палацавыя карпусы, злучаныя драўлянымі галерэямі. У рэзідэнцыю можна было трапіць праз шасціярусную вежу-данжон. Яго вышыня — каля 34 метраў — падкрэслівала высокі палітычны статус уладара замка.

Жылыя пакоі ўпрыгожваў сценапіс. Гэты спосаб аздобы розніцца ад фрэсак тым, што малюецца па сухой тынкоўцы, а не па сырой. І ад таго горш захоўваецца. Праўда, рэшткі малюнкаў, якія мог бачыць яшчэ Вітаўт, трымаліся на сценах аж да XIX ст. Іх сюжэты — выключна свецкія, а ў стылі адчуваецца ўплыў русінскай традыцыі, угрунтаванай на мастацтве Візантыі. Гэта значыць, калі будаваць замак маглі нямецкія дойліды, дык аздабляць яго князь запрасіў майстроў з праваслаўных земляў ВКЛ.

У такім замку можна было жыць, бараніцца і кіраваць дзяржавай.

Трокі настолькі ўдала сталі на выспе сярод возера, што паслужылі ўзорам для пераймання ў іншых краях, цесна звязаных з Вялікім Княствам. Так, у сярэдзіне XV ст. вялікі князь цвярскі Барыс Аляксандравіч, саюзнік ВКЛ, «залажыў... горад сярод возера і назваў яго Трокі». Нават назва, такім чынам, стала пазначаць спецыяльны тып замка на возеры.

## Вітаўтавы Дразды

Пасля Грунвальда пагроза з боку крыжакоў адпала, і Трокі страцілі вайсковую значнасць. Замак стаў выконваць функцыю рэзідэнцыі. Вітаўт бываў у Троках часцей, чым у сталічнай Вільні. У Троцкім замку вялікі князь і памёр у кастрычніку 1430 года, так і не дачакаўшыся каралеўскай кароны.

Ужо ў першай палове XVI ст. замак зноў перабудоўваюць. Ён набыў рэнесансныя рысы, тут любіў бываць кароль Жыгімонт Стары. Апошні Ягелон, Жыгімонт Аўгуст, увогуле ператварыў Трокі ў сваю летнюю рэзідэнцыю.

Разбурылі Трокі, як і многія нашыя замкі, расійскія войскі ў 1655 г. Пасля гэтага замак стаяў у руінах да сярэдзіны XX стагоддзя.

## Сімвал славы і заняпаду

У XIX ст., у часы рамантызму, руіны Троцкага замка сталі маляўнічым сімвалам. Літаратары і мастакі звярталіся да яго вобраза, у якім бачылі і былую славу Літвы, і сведчанне заняпаду краю.

Увага грамадскасці, а таксама актыўная распрацоўка афіцыйнай ідэалогіі заходнерусізму, якая прадугледжвала паглынанне гісторыі даўняй Літвы Расіяй, прымусілі і царскі ўрад выявіць цікавасць да Трокаў. У 1888 г. іх вывучала Імператарская археалагічная камісія, а ў 1905 г. пачалася кансервацыя руінаў. Гэтую працу працягнулі падчас Першай сусветнай нямецкія акупацыйныя ўлады, а ў міжваенны перыяд — польскія даследчыкі.

Але сапраўднае аднаўленне пачалі ўлады Савецкай Літвы — неўзабаве пасля смерці Сталіна, у 1955-м. Для літоўскай грамадскасці і літоўскай савецкай наменклатуры адбудова замка стала дэманстрацыяй прэтэнзій на ўласную аўтаномію ў межах СССР.

## Масква ківала пальчыкам

Імкненне ўладаў Літоўскай ССР адбудаваць замак выклікала неадназначную рэакцыю ў Маскве, праявою чаго стала публікацыя ў газеце «Известия» ў 1960 г. пад назваю «Ці час адбудоўваць замкі?»

Аўтары адзначалі, што такое будаўніцтва дарагое, мільёны рублёў выдаткоўваюцца штогод на ўзнаўленчыя працы, тады як «у самой Вільні дзясяткі дамоў патрабуюць тэрміновага рамонту».

«Паўсюль — ці пойдзеш уніз па Нёмане, на поўнач да межаў Латвіі, ці на захад да Пабярэжжа — усюды ўздымаюцца «замкі-новабудоўлі», — так апісваюць яны Літву пачатку 1960-х. Досыць дзіўны малюнак для савецкай рэспублікі.

Звяртае ўвагу тое, што адзін з галоўных ідэалагічных рупараў Крамля крытыкуе ініцыятараў аднаўлення замкаў не столькі за нацыяналізм, колькі за марнатраўства. І дакарае, што «неабходнае пачуццё меры». Дый нават апошні закід можна трактаваць як даніну хрушчоўскаму змаганню з празмернасцямі ў архітэктуры — тады з праектаў будынкаў здымалі ўсе элементы ўпрыгожання, а гарады запаланілі аднатыпныя «хрушчобы».

Незадавальненне Крамля магло выклікаць яшчэ і тое, што на патрэбы рэстаўрацыі «феадальных замкаў» выкарыстоўваліся сродкі з агульнасаюзнага бюджэту.

А кіраўніцтва Літоўскай ССР, нягледзячы на ўсе інтрыгі, працягвала гнуць сваю лінію. І ўжо ў 1962 г. адчыніліся першыя залы музея ў вялікакняскай рэзідэнцыі.

## Турызм у патрыятызм

Адбудаваны Троцкі замак набыў гатычныя абрысы. Аўтары праекта рэканструкцыі абралі за ўзор замак часоў Вітаўта — эпохі найвялікшай славы ВКЛ. Крытыкі казалі, што адбудаваны замак надта нагадвае крыжацкія. Пра ступень аўтэнтычнасці аднаўлення можна спрачацца, але не трэба забываць, што якраз нямецкія майстры бралі ўдзел у будаўніцтве замка Вітаўта на возеры Гальве.

За савецкім часам адбудаваны Троцкі замак сілкаваў літоўскую ідэнтычнасць, а таксама стаў важным турыстычным аб'ектам. Пабываўшы ў велічных Троках, тысячы літоўцаў захапіліся гісторыяй свайго краю. Замак быў адноўлены ў час.

# Свята па-фінску

Пасля ўзыходу сонца горад мае жахлівы выгляд… Піша **Якуб Лапатка**.



Першамай, па-фінску Vappu, — гэта адно з вялікіх дзяржаўных святаў Фінляндыі. Звычайнае агульнадзяржаўнае фінскае свята заключаецца ў тым, што гарады пусцеюць, на вуліцах ні душы, шынкі поўныя, цвярозых практычна няма. Асабліва вызначаюцца бязлюднасцю гарадоў Раство і Купалле.

Фіны, як і беларусы, — люд вясковы. Вялікае перасяленне народа ў іх пачалося недзе тады, як і ў нас у Саюзе. Толькі прычыны былі розныя. Мы беглі ў гарады і на будоўлі таму, што нам, вясковым мальцам, пачалі даваць пашпарты: ура, канец прыгону, едзем куды хочам ад Буга да Курылаў! І ехалі, а што ж? А фіны на пачатку шасцідзясятых зрабілі індустрыйны гоп-скачок, бо да капейкі выплацілі ваенныя рэпарацыі Савецкаму Саюзу, атрымалі вялікія заказы ад яго ж на караблі, паперу і г.д. Ну і рвануў народ на будоўлі веку.

Практычна ў кожнага фіна дагэтуль ёсць родзічы па вёсках і хутарах, таму кожнае свята, кожны выходны гараджане нават у другім-трэцім калене едуць па вёсках. Толькі не сеяць і садзіць садавіну-гародніну, а проста адпачываць з півам, грылем. Аматары агародаў таксама маюць соткі і летнія дамкі-шпакоўні на гэтых сотках нават пасярод Хельсінкаў. Хельсінкі — гэта спалучэнне вёскі з еўрапейскай сталіцай.

## Свінячаць, але мірна

Сама назва Вапу звязаная са святой Вальпургіяй і здаўна святкуецца як дзень абвяшчэння парэшткаў Вальпургіі святымі мошчамі і іх перазахавання ў царкве Святога Крыжа Айхштэтціна ў 889 годзе.

Свята «вясны і працы» пачалі святкаваць у Фінляндыі з 1898 года, а вольным днём афіцыйна зрабілі ў 1944 годзе. Тут яго пачынаюць адзначаць напярэдадні.

Існуе даўняя традыцыя, якой хельсінскія выпускнікі ліцэяў трымаюцца паўсотні гадоў. 30 красавіка не раней за шостую гадзіну вечара выпускнікі ліцэяў маюць права нарэшце адзець белыя студэнцкія шапачкі. Але спачатку трэба такую шапачку адзець на статую дзяўчыны ў цэнтры горада на бульвары Эспланада. Збіраецца незлічоная колькасць моладзі, усе сутаргава сціскаюць у руках доўгачаканыя шапачкі, піва, віно. А шостай на статую караскаюцца два верхалазы, адзяваюць на Хавіс Аманду (так завецца статуя дзяўчыны) белую шапачку... і пачынаецца.

Раздаецца шалёны крык, узлятаюць на галовы былых школяроў студэнцкія шапачкі, лопаюць коркі і выпіваецца гэтулькі піва, віна ды гарэлкі, што праз гадзіну на цэнтральным квадраце 2x2 км не застаецца ніводнага цвярозага чалавека. Вакханалія цягнецца да самай раніцы. Пасля ўзыходу сонца горад мае жахлівы выгляд: паўсюль пустыя ды бітыя бутэлькі, бляшанкі з-пад піва, пачкі цыгарэт і г.д. Асабліва засвінячана ў цэнтры на тым самым пятачку. Там народ стаіць сцяной, а на суседняй вуліцы ў двух-трох сотнях метраў пуста, нібы пасля чумы. Праўда, парэзаных, пабітых, задушаных і згвалчаных практычна няма. За ўсе пятнаццаць гадоў я бачыў толькі дзве бойкі, а прычынай трэцяй аказаўся я сам.

## Канфлікт за Выбарг

Неяк мой знаёмы інтэлігент з Піцера папрасіў паказаць яму фінскае дно. Я ж як знаўца такіх піўнухаў завёў яго ў адну карчму на Хельсінкскай вуліцы (такая назва), уздоўж якой стаіць шэраг шынкоў самага блатнога пошыбу. Справа ў тым, што там жа знаходзяцца дзве ці тры начлежкі для фінскіх алкашоў. Адпаведна, шустрыя мальцы адкрылі для іх патрэбнага ўзроўню піўнухі. У адрозненне ад «бамжа» на постсавецкай прасторы, фінскі бадзяга — гэта чалавек, які сам сябе апусціў да такога стану. Ён атрымлівае дапамогу па беспрацоўю, некалі атрымліваў грошы на аплату кватэры, на лячэнне, на вучобу і г.д., але пачаў усё прасаджваць, вось яго і турнулі з кватэры, з працы — жыві так, як хочаш. Цвярозымі яны практычна не бываюць, а таму не прасыхаюць ад патрыятызму вышэйшай пробы. Адзін з такіх патрыётаў пачуў нашу расійскую гаворку і падышоў павітаць нас словамі «перкеле рюсся» — чортаў маскаль. Я патлумачыў, што да маскалёў адносін не маю, і параіў ісці міма, на што ён адрэагаваў вельмі нервова: пачаў крычаць, што праклятыя маскалі адабралі ў фінаў Выбарг, Карэлію, што трэба зараз жа забраць іх назад і набіць мне морду. Працоўныя піўныя масы засталіся абыякавыя да гэтага палкага закліку і ажыўлена гаманілі пра той жа Выбарг, дзе танная гарэлка, пра тое, што расійцам добра жывецца з такой таннай гарэлкай і, наогул, спакойна працягвалі абмяркоўваць надзённыя праблемы накшталт таннай гарэлкі ў Расіі і дарагой у Фінляндыі. І ніхто з іх нават не думаў мяне вінаваціць у тым, што з гарэлкай склалася такое становішча. Але патрыёт не супакойваўся: «Панаехалі, праклятыя маскалі! Пазаймалі нашы працоўныя месцы!» Хаця было бачна, што ўсім міратворчым сілам ААН і НАТО разам з ваеннай паліцыяй не ўдасца загнаць яго ні на якое працоўнае месца. Тое ж можна сказаць і пра астатніх пітухоў. Але і на гэты прафсаюзна-справядлівы кліч ніхто не адгукнуўся. Тады ў парадку вынішчэння маскалёў ён паспрабаваў выліць мне за каршэнь рэшткі піва са слінькамі. Давялося нянетла адхіліць, але ён так слаба трымаўся на нагах, што ўляцеў спіной у шкляныя дзверкі шафы з колай ды іншымі безалкагольнымі напоямі, якія не карысталіся аніякай папулярнасцю ў публікі, аднак па закону такія павінны быць у наяўнасці. Пакуль ён выпростваўся з бутэлек ды бітага шкла, бармэн выклікаў паліцыю. Я пціху адправіў прыяцеля на вуліцу, каб у яго не ўзнікла праблем з наступнай візай. І тут я ашалеў ад здзіўлення: усе раптам узняліся на маю абарону: ён і не вінаваты, ён і спакойны, ён і ветлівы, і так добра гаворыць па-фінску, а гэта п'янтос і задзіра. Этнічная салідарнасць не спрацавала. Паліцаі паглядзелі праз камп'ютар у машыне мае дадзеныя: адрас, год нараджэння і адпусцілі мяне з Богам. Патрыёт паспрабаваў кінуцца на паліцэйскіх з крыкамі тыпу: «І вы, Брут, паліцаі, прадаліся маскалям!», але падтрымкі не знайшоў і паехаў у пастарунак.

## Тут Ленін піў піва

Класавыя баі працоўных тут носяць зусім іншы характар. Недзе а дзевятай уранні збіраюцца дзве непрымірымыя групоўкі: сацыял-дэмакраты, шведская партыя, сацыялісты, яшчэ колькі партыяў на самым вялікім пляцы горада — Хаканіемі. Левакі ж — усе кампартыі (не ведаю нават зараз колькі іх), анархісты, прыхільнікі старшыні Мао і маёра Чэ Гевары збіраюцца каля вакзала і ідуць шчыльнымі радамі да той жа плошчы Хаканіемі. Іх суправаджаюць ажно дзве паліцэйскія машыны — адна спераду, другая ззаду. Некалькі чалавек у цывільным з Супо (таемная паліцыя) вядуць здымкі.

Калона а дзесятай прыходзіць на тую ж плошчу, згортвае прылады класавай барацьбы: лозунгі з заклікамі далоў таго-сяго, жыве гэта і гэна! І не меней шчыльнымі радамі кіруецца ў бліжэйшы шынок, які належыць сацыял-дэмакратам ажно з 1904 года, як і вялізны народны дом у шэсць паверхаў. Там класавыя баі разгортваюцца не на жарт. Народу , як у піцерскім метро ў час пік. Усе сёрбаюць піва, бегаюць у шыкоўны туалет, сядзяць на мяккіх канапах, стаяць у праходах і спяваюць песні. У адным з куткоў ёсць так званы «рэвалюцыйны стол». Там нібыта сядзеў сам Ленін з Куусіненам. Халера іх ведае, сядзелі яны ці не, але я там сядзеў. Туды зазвычай садзяцца левакі. І мы спявалі розныя рэвалюцыйныя, расійскія песні, а я нават беларускую песню. Мы пераспявалі эсдэкаў. Самае цікавае тут, што палітычныя праціўнікі ніякім чынам не асабістыя ворагі. Людзі шчыра весяляцца, забыўшыся на абрадавыя і дагматычныя розніцы.

## Прэзідэнтка і суседскія бабы

Людзі цягаюцца па плошчы, слухаюць спевы, самі пяюць, карацей, радуюцца святу «вясны і працы». Сама прэзідэнтка Тар'я Халанен выходзіць прайсціся па вуліцы ў натоўпе. З ёй усяго толькі адзін ахоўнік. Я нават пагаманіў з ёй і павіншаваў з Першамаем. А да таго з ёй ажыўлена балабонілі дзве нейкія кабеты, я потым спытаўся, хто яны. Аказалася, суседзі, бо яе асабістая ўласная кватэра непадалёк, і бабы сказалі, каб не задзірала нос, яны ж яе выбіралі.

І ўвесь гэты час цэнтральныя вуліцы Хельсінкі ўяўляюць сабой вялізны сметнік. Камунальныя службы напоўніцу выкарыстоўваюць сваё права на адпачынак. Вуліцы выліжуць толькі пасля святаў. Але гэта ніяк не ўплывае на святочны настрой працоўнага люду.

**Якуб Лапатка**

нар. у 1944 у вёсцы Аўсюкова (Расонскі раён). Скончыў іспанскі факультэт Мінскага інстытута замежных моваў. Дваццаць гадоў працаваў настаўнікам у Наваполацку. Цяпер жыве ў Хельсінкі (Фінляндыя). Займаецца перакладам фінскай літаратуры на беларускую мову. Аўтар поўнага перакладу фінскага нацыянальнага эпасу «Калевала».

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

### СЦЁБНЫЯ ПАЭТЫ

Покуль валошкі цвітуць над прорваю ў жыце,
слухайце, што кажу, ды іншым перакажыце!

Покуль нябёсы блакітныя й смак вады не іржавы,
покуль зямля яшчэ круціцца песенькай Акуджавы,
сцёбных паэтаў ганіце з нашай дзяржавы!

Покуль сонца белліту яшчэ ў зеніце —
прэч іх ганіце!

Покуль на вечарынах дзеўкі запальваюць свечкі —
ганіце прэчкі!

Лірыкі ад сахі й студэнткі–філалагіні,
прэч іх ганіце, іначай усё загіне!

Там, дзе святое, дзе нашы душы рукаюцца,
гэтыя вырадкі мацюкаюцца!

Вершаў не носяць ні ў «Маладосць», ні ў «Полымя»,
толькі здымаюцца голымі!

Там, дзе пісалі крывёй аб галоўным,
весела клоўнам!

Ледзь залунае штандар Адраджэння —
дулі ў кішэні!

Нашай дзяржаўнасці першая спроба —
тэма для сцёбу!

Гэта не лечыцца, бл…ь!
Усіх расстраляць!

Выслаць усіх пажыццёва, але не ў Румынію,
каб не на Чорным моры згадвалі сінюю–сінюю!

Хай папакутуюць, хай папакуюць цёплыя рэчы,
а калі хто загнецца зусім, на сухоты хварэючы, —

узгадаем няздару, які праваліў свой тайм,
і адзіны нясцёбны верш яго прачытаем.

Адкаркуем бутэльку, закускі насмажым.
Пасядзім удваіх — і трэцяму падалькажым.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Андрэй Хадановіч**

(нар. у 1973) — паэт, аўтар кніг «Бэрлібры», «Сто лі100ў на tut.by». Старшыня Беларускага ПЭН–Цэнтра. Змяніў стэрэатыпы пра беларускую паэзію.

Вершаў не носяць
ні ў «Маладосць», ні ў «Полымя»,
толькі здымаюцца голымі!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Парад феерверкаў**

**8 мая ў «Лагойску»** пройдзе фестываль «Парад феерверкаў». Гледачы змогуць убачыць выступ найлепшых піратэхнікаў Расіі, Украіны і Беларусі, а таксама ваенна–гістарычнае шоу трох эпох — Вялікага Княства Літоўскага, напалеонаўскіх войнаў і Другой сусветнай. Да пляцоўкі фестывалю можна дабрацца на сваім аўто (бясплатная паркоўка на 1000 машын) і на бясплатным аўтобусе, што будзе курсіраваць ад Нацыянальнай бібліятэкі. **Пачатак праграмы а 17-й.**

## КАНЦЭРТЫ




### Турнэ «Океана Ельзи»

«Океан Ельзи» наведае Беларусь падчас тура ў падтрымку новага альбома «Dolce Vita». Маршрут украінскіх музыкаў выглядае наступным чынам: **Бабруйск (11 мая)**, **Мінск (12 мая)**, **Баранавічы (15 мая)**, **Гродна (16 мая)**, **Гомель (18 мая)**, **Брэст (19 мая)**.

А **22 мая** «ОЕ» выступіць разам з Горанам Брэгавічам у якасці хэдлайнераў на трэцім рок-фестывалі «Stare Misto» **у Львове**. 8–гадзінны канцэрт пройдзе на мясцовым стадыёне «Украіна». Горан Брэгавіч прывязе ў Львоў сваю новую праграму «Alcohol». Цана квіткоў пачынаецца ад 40 грыўняў (каля $5).

Гурт «Океан Ельзи» быў створаны напрыканцы 1994 г. у Львове. У 1998 г. музыкі пераехалі ў Кіеў. Тады ж быў запісаны дэбютны альбом «Там, де нас нема», які прынёс гурту славу і вядомасць не толькі ў сваёй краіне.

### Scorpions. Апошняе турнэ

У апошні раз паслухаць Клауса Майнэ са сцэны пра яго шпацыр па парку Горкага (балада Wind of Change) і пра яго ўпартую барацьбу за каханне (Still lovin' you) можна будзе **29 красавіка пад дахам «Мінск-Арэны» (пр. Пераможцаў, 111)**.

Нагадаем, сёлета хард–рокеры, якія сваёй творчасцю актыўна расхіствалі «жалезную сцяну» Берлінскага мура і настройвалі на рамантычны і паблажлівы лад мільёны сэрцаў (у тым ліку і савецкага генсека Гарбачова), абвесцілі пра заканчэнне сваёй зорнай (і часам паласатай) кар'еры. А перад выхадам з 40–гадовым стажам на заслужаную пенсію «Скарпы» едуць у развітальнае турнэ пад назовам Get Your Sting And Blackout. Сярод першых адрасоў гэтага турнэ — беларуская сталіца.

Квіткі: ад 75 000 да 225 000 рублёў, танцпляц — 150 000 рублёў, фан–сектар (гэта ля саменькай сцэны) — 200 000.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Новы альбом Віктара Шалкевіча

**28 красавіка ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Купалы, 21)** выступае Віктар Шалкевіч з новым альбомам «Шчаслівая сямёрка». **Пачатак а 19-й.**

### Вайцюшкевіч з веснавой праграмай

**28 красавіка на Малой сцэне Купалаўскага тэатра (вул.Энгельса, 12)** — канцэрт Змітра Вайцюшкевіча з праграмай «Праз усю вясну». **Пачатак а 19-й.**

### Камоцкі ў Купалаўскім

**5 мая а 19-й на Малой сцэне Купалаўскага тэатра** выступае Алесь Камоцкі з праграмай «Мітусня каляровых дзён». Спосаб набыцця квіткоў толькі адзін — патэлефанаваць (029) 253–25–04 і набыць, і ніяк іначай.

### «Яблычная гарбата» і Нікалас Бёрд

Амерыканскі джазавы вакаліст Нікалас Бёрд у суправаджэнні джаз–банда «Яблычная гарбата» **28—29 красавіка выступіць на сцэне Малой залы КЗ «Мінск»**. **Пачатак а 19-й.**

### Красавіцкае танга з Аляксеем Жбанавым

**30 красавіка ў 19:00 у бібліятэцы імя Пушкіна (вул. Гікалы, 4)** адбудзецца прэзентацыя дэбютнага альбома барда Аляксея Жбанава «Песні для мамы». Спевы на ўласныя вершы і на вершы Міцкевіча, Багушэвіча і Караткевіча. Удзел у канцэрце возьмуць сябры спевака: музыкі Раман Абрамчук, Андрусь Такінданг, паэты Марыя Мартысевіч, Андрэй Хадановіч і іншыя. Уваход на імпрэзу вольны.

## ІМПРЭЗЫ

### Ліцвіны

**29 красавіка а 19-й у Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** пройдзе сустрэча з калектывам этнічнай музыкі «Ліцвіны». У музейнай зале гурт «Ліцвіны» і тэатр «Гістрыён» прапануць сумесную музычна–танцавальную праграму. Прагучаць традыцыйныя танцавальныя мелодыі і напевы Беларусі.

### Сустрэча з «Майстроўняй»

**30 красавіка а 18-й на сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13)** адбудзецца вечарына — «Успаміны сяброў «Беларускай спеўна–драматычнай майстроўні». Сябры «Майстроўні» распавядуць пра пачатак нацыянальнага адраджэння ў 1980–я, прыгадаюць цікавыя гісторыі, праспяваюць любімыя народныя песні. Запрошаныя Алена Анісім (Амельчыц), Верця Кандраль (Лазоўская), Генік Лойка.

### Часопіс «ПрайдзіСвет»

**29 красавіка а 19-й у «КнігарніЎгалерэі» (пр. Незалежнасці, 37а)** пройдзе прэзентацыя чацвёртага нумара інтэрнэт–часопіса перакладаў на беларускую мову «ПрайдзіСвет».

## ВЫСТАВЫ

### Шляхецкі скарб

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 30 красавіка** працуе выстава «Шляхецкі скарб», на якой прадстаўлена аўтарская калекцыя сцэнічных касцюмаў Наталлі Смаляк, створаная па матывах гістарычных касцюмаў XVI—XVII стст. Тут можна ўбачыць касцюмы з серый «Чорная Панна», «Шляхецкі скарб», «Белая Панна».

### Ноч музеяў

**15 мая Мастацкі музей** возьме ўдзел у міжнародным арт–праекце «Ноч музеяў». **Ад 19.00 да 00.00** музей запрашае на «Вечар у французскім стылі». Продаж квіткоў — ад 5 мая.

### Галерэя гістарычных дзеячаў Марачкіна

Да 70–годдзя мастака Аляксея Марачкіна прымеркаваная яго выстава «Постаці гісторыі і культуры Беларусі». Выстаўлена каля трыццаці графічных палотнаў. Гэта і даўно знаёмыя вобразы Кастуся Каліноўскага, Міхала Клеафаса Агінскага, і новыя працы — паўстанка Эмілія Плятар, генерал Булак–Булаховіч, рэвалюцыянерка Палута Бадунова. Мастак асобна адзначае партрэт маладога Францішка Скарыны, які лічыць сваёй адметнай працай. Выстава працуе **на сядзібе БНФ (пр.Машэрава, 8)**.

### Пагоня на Грунвальд

**У мінскай дзіцячай бібліятэцы №10 (пр. Незалежнасці, 123-3) да 2 мая** працуе мастацкая выстава, прымеркаваная да 600–годдзя Грунвальдскай бітвы.

### Марыністы ў Гомелі

**Да 12 мая ў Палацы Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі** працуе выстава з фондаў Мастацкага музея Беларусі. У экспазіцыю ўвайшлі творы І.Айвазоўскага, А.Бегрова, П.Тызенгаўзена, І.Крачкоўскага…

### Іканапіс XVI-XIX стст.

**Да 23 ліпеня ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Святыя заступнікі ў праваслаўным іканапісе XVI—XIX стагоддзяў».

### Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі

**У Гістарычным музеі да 10 мая** працуе выстава «Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі». Дакументы, фатаграфіі, газетныя публікацыі, кнігі, размешчаныя на выставе, раскажуць пра цікавую асобу — Рышарда Капусцінскага.




### Жывапіс у Нармандыі

**У Мастацкім музеі да 25 мая** працуе выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

### Ваенна-гістарычная мініяцюра

**У Гістарычным музеі да 30 мая** працуе выстава Ігара Гарбунова «Ваенна–гістарычная мініяцюра». На выставе прадстаўленыя мініяцюры воінаў Старадаўняга Рыма, галандскіх воінаў…

## ТЭАТРЫ

**28 красавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Тэатр юнага гледача** — «Маленькія трагедыі»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

**29 красавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой». Прэм'ера
**Тэатр оперы і балета** — «Алека»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар'яцелага музыкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**30 красавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой». Прэм'ера
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**2 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой». Прэм'ера
**Тэатр імя Горкага** — «У вайны не жаночае аблічча»

**3 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»

**4 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»

**5 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**6 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»

**7 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**8 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

## КІНО

# Вар'яцкае спатканне

**Date Night**

ЗША, 2010, каляровы, 88 хв.

**Рэжысёр:** Шон Леві

**Жанр:** Камедыйна–рамантычны трымценнік

**Адзнака:** 5 (з 10)



Ціхія муж з жонкай Фостэр, якія пачынаюць нудзіцца адно з адным, ідуць у модную рэстарацыю. Каб атрымаць столік, героі выдаюць сябе за іншых людзей. І дарэмна! Цяпер за самазванцамі палююць мафія і паліцыя.

Рэжысёр Шон Леві, які раней паставіў «Ноч у музеі», не хапае зорак з неба. Карціна шараговая і сціплая, як і самі героі. Але ў гэтым фільме — «для тых, каму за трыццаць» — адсутнічаюць сарцірныя жарты і брутальныя сцэнкі.

Самае важнае — звычайныя чалавечыя пачуцці ў незвычайных умовах крымінальных прыгодаў. Герой–цюхця пагражае пісталетам, лятуць у ваду крадзеныя машыны, мафія і прадажныя палітыкі ў шоку ад хэпі–энда.

Карціна пасуе сямейным парам, якія на 20–годдзе вяселля вырашылі схадзіць у кіно.

**Андрэй Расінскі**

# Дзе самы танны мабільны інтэрнэт?

Параўноўваем цэны ад Velcom, МТС і Life:)

Аператар мабільнай сувязі МТС нарэшце запусціў 3G-сетку ў камерцыйную эксплуатацыю . Гэта значыць, што цяпер усе тры аператары прапануюць сваім абанентам звышхуткасны інтэрнэт. Пачынаецца сапраўднае рынкавае змаганне за спажыўца. «НН» дапамагае знайсці шлях у лабірынтах тарыфных планаў.

### Галоўнае — вылічыць трафік

Кожны з трох аператараў знайшоў што прапанаваць як выпадковым наведвальнікам інтэрнэту, якія з’яўляюцца ў сеціве пару разоў на тыдзень, звычайна праз мабільны тэлефон, так і тым, каму трэба трафік ледзь не ў прамысловых памерах. Але ўсе тарыфныя планы аб’яднаныя абавязковай умовай — у іх ёсць абаненцкая плата, якая ўтрымлівае ў сабе перадаплачаны трафік.

Цяжкасць для параўнання ў тым, што аператары абралі розныя прамежкавыя ўзроўні. Напрыклад, Life:) мае пазнаку ў тарыфікацыі ў 500 мегабайтаў. Наступны ж узровень у яго складае 2 гігабайты (49 000 рублёў), значыць абанент, які мае патраціць усяго 750 МБ, усё адно мусіць расшчодрыцца на 49 000, а рэшткі трафіку згараць у яго ў канцы месяца.

Каб абраць самага выгаднага для сябе аператара, трэба прыкінуць, які аб’ём трафіку вы скарыстаеце за месяц. У гарызантальнай восі нашага графіка — аб’ём трафіку, ранжыраваны ад 50 МБ да 4 ГБ. Вертыкальная вось — колькасць грошай, якую прыйдзецца выдаткаваць.

**Кошт мабільнага інтэрнэту ў Беларусі**




| | 75 | 100 | 150 | 500 | 600 | 750 | 1000 | 1500 | 2000 | 2500 | 3000 | 4000 | 5000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **МТС** | 13 500 | 13 500 | 18 000 | 30 000 | 31 500 | 37 500 | 37 500 | 45 000 | 67 500 | 67 500 | 99 000 | 99 000 | 99 000 |
| **Велком** | 11 800 | 24 900 | 24 900 | 24 900 | 24 900 | 24 900 | 45 000 | 45 000 | 55 000 | 90 000 | 90 000 | 99 000 | |
| **Лайф** | 10 000 | 10 000 | 19 000 | 19 000 | 49 000 | 49 000 | 49 000 | 49 000 | 49 000 | 69 000 | 69 000 | 99 000 | 99 000 |

### Лідэрства Life:)

Выходзіць, што карыстацца паслугамі Life:) выгадна тым, хто выдаткуе мала трафіку — не больш за 500 МБ. Патэнцыйныя абаненты Velcom — тыя, хто выкарыстае для працы і адпачынку ад 501 да 750 МБ. Гігабайт трафіку — адзінае моцнае месца МТС. А вось тым, хто выкарыстоўвае больш за 2 ГБ інфармацыі, зноў варта аддаць перавагу Life:). Прапановы аператараў сыходзяцца ў адной і той кропцы ў канцы графіка. За 99 тысяч рублёў Velcom прадастаўляе 4 ГБ трафіку, а МТС і Life:) — па 5 гігабайтаў.

Асобнымі радкамі варта ўзгадаць іншыя прапановы ад МТС і Life:). Першы забяспечвае інтэрнэтам без абмежавання трафіку за 290 тысяч рублёў на тарыфным плане «Абсалют». Другі ж прапануе начны інтэрнэт (ад 1.00 да 8.00) коштам 29 тысяч рублёў за месяц, прычым за гэтыя грошы атрымліваеш 10 ГБ трафіку. А таксама паслугу «Інтэрнэт на суткі» — 2900—4900 рублёў у залежнасці ад аб’ёму скарыстанага трафіку.

**Яўген Васількоў**

Сапраўдная беларуская кухня

### Белая страва

**Пучок гародніны, 1—2 падсмажаныя цыбуліны, 1 морква, крыху сельдэрэю, пятрушкі, масла, туку з мяснога булёну, 3 лыжкі мукі, 2 жаўткі, паўкубка салодкай смятаны, галоўка капусты або рыс, зеляніна кропу або пятрушкі.**

Варыць падсмажаныя цыбуліны з пакрышанай гароднінай. Асобна падсмажыць на масле дробна пакрышаную моркву, сельдэрэй (салеру), пятрушку, падліваючы туку. Заліць невялікай колькасцю навару з гародніны. Асобна падпражыць муку, развесці паўкубкам халоднай вады, уліць у страву, заварыць, працадзіць. Асобна расцерці жаўткі са смятанай, развесці, добра памешваючы, цёплым булёнам, заварыць. Капусту ці рыс (звараныя раней) накласці на талеркі і заліць прыгатаванай стравою. Пасыпаць кропам ці пятрушкай.

**Паводле кнігі «Вялікалітоўская (беларуская) кухарка» (Нью-Ёрк, 1959), падрыхтавала НБ**

стыль

## Як выбраць парфуму на лета

Блізкае лета не толькі нас распранае, але і прымушае пераходзіць на іншы водаравы рэжым, дыктуючы колькі і як духмяніцца. Зразумела: у кожнай жанчыны ёсць свае асабістыя ўпадабанні. Але існуе колькі агульных правілаў, якіх варта трымацца, купляючы парфуму.

**Сачыце за прагнозам.** Парфума мусіць быць падрыхтаваная на розныя варыянты развіцця падзеяў. У спякотнае лета мы карыстаемся далікатнай, лёгкай парфумай з асвяжальным водарам. Як чэрвеньскае або жнівеньскае надвор’е «шэпча», то можна надушыцца насычанымі водарамі больш пікантных гатункаў. Гэтая парада асабліва карысная тым, хто залішне пацее або мае павышаную актыўнасць малочных залоз.

**Рухавым — Eau de Toilette.** Кабетам і дзяўчатам, што інтэнсіўна займаюцца спортам або маюць рухавую працу, лепей карыстацца туалетнай вадой (надпіс на этыкетцы Eau de Toilette), а не парфумай (Eau de Parfum). Раім ім выкарыстоўваць водары, што добра спалучаюцца з адпрыродным пахам цела.

**Сачыце за вентыляцыяй.** Тая, што працуе ў офісе, дзе ёсць кандыцыянер ці добрая вентыляцыя, можа карыстацца больш насычанай парфумай.

**Адна — на раніцу, другая — на вечар.** Як стае грошай, дык лепей купіць лёгкую парфуму на ранішнія гадзіны і больш насычаную водарамі — на вечар.

**Адна пахавая гама.** У дадатак да парфумы пажадана карыстацца дэзадарантамі і крэмамі для цела, якія маюць з ужыванай парфумай аднолькавы букет водараў ды набор складнікаў. Калі не карыстаецеся адной серыяй, дык лепей, каб крэм для цела або дэзадарант былі зусім без паху і не змяшчалі парфумаваных дадаткаў (т.зв. нейтральны крэм ці дэзадарант).

**Каб пазбегнуць плямаў на скуры.** Нельга пшыкаць парфуму на часткі цела, якія будуць адкрытыя летняму сонцу, — алкаголь, на які трапляюць промні, можа спрычыніцца да ўтварэння плямаў на скуры.

**Захоўваць парфуму**, каб яна захавала ўсе адценні водару, трэба ў халаднаватым і сухім месцы.

**Ліза Кавальчык**



**Мадэльер Дэрэк Лам стварыў для гэтага лета калекцыю, натхнёную саракавымі гадамі. Яна ўключае жаночыя сукенкі і касцюмы, што элегантна адкрываюць ногі.**

тэхналогіі

## Армія ЗША пасылае ў космас беспілотны ракетаплан

Ракетаплан — не баявая сістэма. Гэта эксперыментальная касмічная платформа шматразовага выкарыстання для вайскова-паветраных сілаў.

Вытворцам X-37B з’яўляецца кампанія «Боінг». Ракетаплан мае даўжыню 8,9 метра і размах крылаў 4,5 м; яго ўзлётная вага дасягае 5 тон. Для сілкавання бартавога абсталявання выкарыстоўваюцца сонечныя батарэі.

Падчас першага арбітальнага палёту X-37B тэставацца будуць упершую чаргу сістэмы аўтаматычнага кіравання і тэрмічнага рэгулявання; апошняя абараняе апарат ад перагрэву пры ўваходзе ў шчыльныя слаі атмасферы.

**КаМ**

Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем Алену і Аляксандра Паляковых** з нараджэннем унучкі. Няхай расце здаровая і цешыць увесь род. Сябры.

**КНІГІ**

**Набуду** кнігу Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» на беларускай альбо некалькіх мовах. Т.: (029) 550–22–55.

**Набуду** кнігі Васіля Супруна. Т.: (029) 383–00–06.

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Прага—Дрэздэн** 13—17 мая. Т.: (017) 292–54–58; (029) 622–57–20; (029) 509–12–16.

**Падарожжа па лідскім наваколлі** 2 мая па маршруце: Вавёрка—Белагруда—Тарнова—Нецеч—Беліца—Дзікушкі—Голдава—Радзівонішкі.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!




**Катла заўжды абуджаўся праз паўгода пасля Эяф’ятлаякудля.**

навука

## Праз паўгода выбухне вулкан-гігант?

Брытанскія эксперты прагназуюць у найбліжэйшыя месяцы выбух ісландскага вулкана Катла — значна мацнейшы за выбух Эяф’ятлаякудля. Кожны раз, калі Эяф’ятлаякудль выбухаў у мінулым тысячагоддзі, пасля яго выбухаў вулкан Катла. Гэта было ў 920, 1612 і 1821 гадах.

Апошні раз абодва вулканы адазваліся ў 1918 годзе.

Прэзідэнт Ісландыі Олафур Грымсан паведаміў, што яго краіна рыхтуецца да выбуху Катлы ўжо некалькі гадоў, і ўсе кампаніі-перавозчыкі павінныя падумаць, як даць гэтаму рады.

**КаМ**

## Кемікі



1. Што з новага года не нарастае, а ўбывае?
2. Што знаходзіцца ў сярэдзіне зямлі?
3. З якога палатна нельга пашыць сукенку?
4. Па чым часта ходзяць, а ніколі не ездзяць?
5. Закрычаў ноччу пеўнік, пабудзіў аднаго чалавека. Колькі трэба пеўнікаў, каб пабудзіць 10 чалавек?
6. Што застанецца ў слоіку, калі адтуль забяруць усё варэнне?
7. На двары скакала 5 вераб’ёў і 4 сініцы. Кот падкраўся і схапіў аднаго вераб’я. Колькі птушак засталося на двары?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы на старонцы 16.**




**Пасля загаду ўпрыгожыць мінскія крамы да 9 Мая ў вітрынах з'явіліся манекены-ветэраны.**




**«Сцяну Віктара Цоя» — два фрагменты бетоннай будаўнічай агароджы, спісанай графіці і вершамі прыхільнікаў культавага расійскага спевака, — усталявалі ў скверы на перасячэнні вуліц Беларускай і Ульянаўскай, непадалёк ад стадыёна «Дынама». Паспрыялі гэтаму фанаты творчасці Цоя, якія перадалі ў Мінгарвыканкам каля 2000 подпісаў.**



**Падчас парада ў Каракасе з нагоды 200-годдзя абвяшчэння незалежнасці Венесуэлы быў заўважаны Віктар Шэйман. Выглядаў ён вельмі па-лацінаамерыканску.**




**Выходнымі ў Сілічах прайшоў Грунвальдскі фэст.**





**Даляр перастае быць зялёным: так выглядае абноўленая стодаляравая купюра, якая хутка з'явіцца ў абарачэнні. Банкнота захоўвае традыцыйны выгляд, але мае некалькі істотных адрозненняў. Сотня стала больш «каляровай», чым цяперашняя. На пярэднім баку справа ад партрэта Франкліна з'явілася ахоўная паласа з галаграфічнымі выявамі. На купюры маецца выява звана, на якім, калі прыглядзіцца, можна пабачыць ахоўныя знакі.**



**Тыгрыная пяшчота. Белае тыграня з нямецкага заапарка вырашыла пагладзіць свайго ветэрынара.**



**Карціна Марка Шагала «Рэвалюцыя» (1968), якая раней ніколі не экспанавалася, стане топ-лотам таргоў жывапісам імпрэсіянізму і мадэрнізму на аўкцыёне Bonhams. Таргі пройдуць 22 чэрвеня ў Лондане. Шагал любіў карціну і захоўваў яе ў сябе дома. Палатно ацанілі ў 1,2—1,8 млн фунтаў.**

## Анекдоты

* * *

Акварыум — гэта інтэрактыўны тэлевізар для катоў.

* * *

Куплю лом каляровых металаў. Яшчэ раз нагадваю: чырвоныя ламы з пажарных стэндаў — гэта не тое.

* * *

Калі самец зможа хутка адбегчыся на бяспечную адлегласць, ён застанецца жывы. Гэта пра павукоў. А вы што падумалі, мужыкі?

* * *

Нобелеўскую прэмію па літаратуры сёлета дадуць чалавеку, які першы напіша без памылак назву таго самага ісландскага вулкана.

* * *

Што супольнага паміж паранджой і міні-спадніцай? І першая, і другая дапамагаюць схаваць твар.

* * *

— Ці ведаеце вы, што сабачая запрэжка будзе рухацца ўдвая хутчэй, калі ў сані пасадзіць хоць аднога карэйца?

* * *

У адэскім порце.
— А што, той вялікі танкер сапраўды прывёз з Венесуэлы нафту для Лукашэнкі?
— Такі да! І ўчора яе ўжо бачылі на Прывозе.

## «НН» сто гадоў з вамі

**З Мінска.** Камароўскі домаўласнік Зандлер (сын фурмана камароўскага вотчынніка — Ваньковіча, ён жа і пісар у натарыуса), схадна выкупіўшы колькі дзясяткаў дзесяцін Ваньковічавай зямлі, гандлюе вадой. За 1—2 вядры вады са сваёй студні (вада, праўда, не абы-якая, бо пахне Залатагорскімі магілкамі) бярэ 8—10 рублёў у год.

**«НН». №16—17. 1910**

**Віктар Шніп. Сабачыя гісторыі**

Адзін сабака купіў газету. Пачаў чытаць. Усё пра Граждана.

**«НН». №17. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**
1. Каляндар. 2. Літара «М». 3. З чыгуначага. 4. Па лесвіцы. 5. Адзін. 6. Паветра. 7. Ніводнай, яны спужаліся і паляцелі.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА.**
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.04.2010.
Замова № 2036.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 10016